ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 33 (1107) 17 жніўня 2013 г. Кошт 4 500 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

РЫЦАРСКАЕ ЛЕТА — ДОБРАЯ ПРЫКМЕТА!

Гэтае лета, як і заўжды, насычана разнастайнымі **рыцарскімі злётамі і фестывалямі сярэднявечнай культуры.** Кадр зроблены на нядаўнім, шостым па ліку, мсціслаўскім фэсце. Не прапусціце іншыя захапляльныя рыцарскія імпрэзы ў бягучым сезоне!

Фота Вольгі СЕМЧАНКА

Рэакцыя на рэдакцыю: **прамоўшн дакументальнага кіно** С. 4 — 5

Музычны дэтэктыў пра Манюшку: **ёсць сенсацыі!** С. 6

Грымёркі "без грыму": **што пішуць у сацыяльных сетках?** С. 7

Аўтапрабег па СДК і не толькі: клуб можа закрыцца С. 10 — 12

Вопыт шведскіх музеяў: **што пераняць?** С. 13

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

А справа ў скрынцы?

Бібліятэкам патрэбна дзейства замест гутарак з графаманамі ды безнадзейных кніжных выставак

...Прайшлі гады. Зніклі ў кнігарнях і бібліятэках скрынкі з паэтычнымі зборнікамі кішэннага фармату, якія называлі "брацкімі могілкамі". Але бібліятэчныя дагматы засталіся. Так, яны — іншыя. Але ад іх па-ранейшаму, даруйце, "патыхае пылам". Так, усё дазволена, аднак няма галоўнага — "прафесійных" чытачоў. Як можа прывіць павагу і любоў да Слова чалавек, які сам яго не любіць? Часу няма: каталагізацыя, улік, спісанне... Да павуціння паміж стэлажамі яшчэ не дайшло, але дзяцей цяпер і пугай да кніг не падгоніш (калі гэта, натуральна, не праграмная літаратура). Легендарная "Вёска" Андрэя Федарэнкі стаіць на вясковых стэлажах некранутай...

С. 4

МАБІЛЬНЫ АЎДЫЯГІД ПРЭЗЕНТАВАЛІ Ў МІНСКУ

Фота Юрыя ІВАНОВА

С. 2

Падзея

VIII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета пройдзе сёлета з 2 па 12 кастрычніка і прапануе прыхільнікам музыкі каля дзясятка выбітных канцэртаў.

Набіраем абароты!

— Відавочна, што форум набірае абароты, — распавёў карэспандэнту "К" мастацкі кіраўнік фестывалю, лаўрэат міжнародных конкурсаў, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Расціслаў Крымер. — Сёлета асаблівасцю яго стане яшчэ большы разгорт і маштабнасць. Адметным, запамінальным, а шмат у чым і нечаканым стане ўжо само адкрыццё, бо яго праграма з'яднае розныя віды мастацтваў: музыку, паэзію, жывапіс. Выстаўка, якая адкрыецца ў гэты дзень, будзе працаваць цягам усяго фестывалю. А ў канцэрце мае ўдзельнічаць Канстанцін Хабенскі — вядома, не ў якасці музыканта. Вершы ў яго выкананні прыцягнуць у Канцэртную залу Беларускай дзяржаўнай філармоніі нават тых, хто раней, можа, не надта цікавіўся музычнай класікай. Але ўсе арганізатары, фундатары і ўдзельнікі вечарыны ўпэўнены: пабываўшы на такім канцэрце, слухачы абавязкова прыйдуць і на іншыя.

Не буду раскрываць усіх сакрэтаў, але відавочна, што яшчэ адной з кульмінацый фестывалю стане канцэрт 8 кастрычніка: "Лаўрэаты Міжнароднага конкурсу імя П.Чайкоўскага ў гасцях у Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета". А якая грандыёзная беларуская прэм'ера чакае вас сёлета! Гэта будзе твор Валерыя Воранава — выпускніка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па класе народнага артыста краіны, прафесара Дзмітрыя Смольскага. Апошнім часам Валерый жыве і працуе пераважна ў Германіі, мае сапраўднае прызнанне ў Еўропе...

Цікавілася Надзея БУНЦЭВІЧ

Навінка

Восем паштовых марак з выявамі герояў айчыннай анімацыі рыхтуюцца да выпуску ў выдавецкім цэнтры "Марка" Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Белпошта". Выпуск адпаведнага блока філатэлістычнай прадукцыі стаў плёнам супрацоўніцтва кампаніі і Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм".

Анімацыйная прэм'ера

Як паведаміў карэспандэнту "К" дырэктар студыі анімацыйных фільмаў кінастудыі "Беларусьфільм" Ігар Галіноўскі, у серыі было вырашана скарыстаць фрагменты стужак дзіцячай тэматыкі. Для філатэлістычнай адаптацыі абраны персанажы фільмаў Аляксандра Ленкіна — "Рыбка па імені Нельга", "Прыгоды рэактыўнага парасяці", Ігара Волчака — "Прыгоды Несцеркі", Тацяны Жыткоўскай — "Пра дзяўчынку Жэню", Алены Пяткевіч — "Беласнежка і Пунсацвецік", Уладзіміра Пяткевіча — "Воўк і Баран", Тацяны Кубліцкай — "Піліпка" і "Сараканожка".

— Праца над гэтым блокам марак запомнілася, — адзначае дызайнер выдавецкага цэнтра "Марка" Кацярына Прыёмка. — Было вельмі цікава працаваць з падобным матэрыялам, і ў выніку атрымаліся яскравыя ды маляўнічыя работы…

Да серыі з васьмі марак далучыцца канверт першага дня, які прэзентуюць у дзень гашэння марак. Адбудзецца анімацыйная паштовая прэм'ера, па словах спецыяліста, напрыканцы восені — у лістападзе.

Праект з выдавецкім цэнтрам "Марка", падкрэсліў Ігар Галіноўскі, прымеркаваны да 40-годдзя беларускай анімацыі, якое кінастудыя адзначала летась. Зараз на "Беларусьфільме" завяршаецца рэмастэрынг "піянераў" айчыннага анімацыйнага кіно — стужак Уладзіміра Голікава "Няўдачнік" ды "Два погляды на адно і тое ж" (абедзве — 1972-га года), якія ў хуткім часе будуць паказаны ў рамках маштабнага праекта "Беларуская мультпанарама. 40 гадоў на экране ў Музеі гісторыі беларускага кіно". Гэтыя паказы, адзначае дырэктар студыі анімацыйных фільмаў, можна будзе лічыць прэм'ернымі.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Прэзентацыя

Ляцім на крылах Дзён культуры

Дні культуры Беларусі ў Літве пачнуцца 21 верасня і будуць доўжыцца амаль два з паловай месяцы, ажно да 1 снежня.

Праграма, як паведамілі ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы, плануецца вельмі разнастайная. Сімвалічна, што ў канцэрце адкрыцця сумесна выступяць музыканты абедзвюх краін: у Нацыянальнай філармоніі ў Вільнюсе з Літоўскім камерным аркестрам пад кіраўніцтвам Сяргея Крылова будзе саліраваць наш Расціслаў Крымер, як гэта было і летась у нашай сталічнай філармоніі. На іншых пляцоўках у дзень адкрыцця выступяць і Дзяржаўны камерны хор Беларусі на чале з Наталляй Міхайлавай, і Гродзенскі камерны аркестр (у рамках VIII Міжнароднага фестывалю імя М.Агінскага). VIII Свята беларускай песні адбудзецца ў Клайпедзе. Музычна-паэтычную вечарыну да 150-годдзя паўстання К.Каліноўскага рыхтуе з ансамблем салістаў "Класік-Авангард" Уладзімір Байдаў.

Насычаным будзе тэатральны складнік. З прэм'ерай балета "Князь Вітаўт" Вячаслава Кузняцова рушыць да суседзяў наш Вялікі тэатр. Дзяржаўны маладзёжны тэатр пакажа "Варшаўскую мелодыю" Леаніда Зорына. Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі — дзве п'есы вядомых айчынных драматургаў: "Тры Жызэлі" Андрэя Курэйчыка і "Дажывём да прэм'еры!" Мікалая Рудкоўскага. Беларускі дзяржаўны музычны тэатр правядзе гастролі ў Клайпедзе, а праз паўтара месяца — у Каўнасе. Трохдзённыя гастролі — у Вільнюсе, Клайпедзе, Марыямпалі — чакаюць і Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі на чале з народным артыстам краіны Валянцінам Дудкевічам.

Жывапіс будзе прадстаўлены выстаўкай сучасных беларускіх мастакоў. Не дзіва, што нашы творцы ўвойдуць і ў лік лаўрэатаў акцыі "Светачы-2013" Фонду імя М.Чурлёніса — за значны ўнёсак па ўмацаванні супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, музыкі, выяўленчага мастацтва і тэатра.

Фотаанонс

Сустрэча з QR-кодам

На прыступках Дома-музея I З'езда РСДРП пасля прэзентацыі сістэмы мабільнага аўдыягіда і QR-кодаў я сустрэў Аляксея Агеенку і Жанну-Марыю Дрысэн. Яны па мабільным тэлефоне даслухвалі інфармацыю аўдыягіда. Жанна-Марыя Дрысэн прыехала ў Беларусь з Амстэрдама. Гэта другі яе візіт у нашу краіну: першы адбыўся 20 гадоў таму. Пра тое, якія агульныя інтарэсы ў фатографа з Галандыі і аператара айчыннага тэлебачання, мы распавядзём у наступных нумарах нашай газеты. Не прапусціце!

Юрый ІВАНОЎ Фота аўтара

Арт

Мадонны...

15 жніўня ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адкрылася персанальная выстаўка жывапісу Аляксея Кузьміча, на якой аўтар прадставіў больш за 90 палотнаў.

Аляксей Васільевіч вось ужо шмат гадоў паспяхова працуе над вобразам Мадонны, праз які імкнецца ўвасобіць ідэалы дабрыні, чысціні і хараства як сімвалу жыцця і адраджэння славянскай духоўнасці.

Фестываль

І новая музыка

З 6 па 8 верасня Мір, Любчу і Гродна аб'яднае Музычны фестываль, прысвечаны творчасці кампазітара Мікалая Дзмітрыевіча Набокава (1903 — 1978 гг.) і прымеркаваны да 110-годдзя з дня яго нараджэння.

Музыка Набокава ўпершыню прагучала ў Беларусі толькі ў 2011-м — у Мірскім і Любчанскім замках. Забытая спадчына нашага земляка адрадзілася на ягонай Радзіме, даўшы пачатак правядзенню Музычных фестываляў.

Праграма фестывалю Набокава на яго радзіме сёлета прадугледжвае паказ міні-спектакля "Чамадан успамінаў" У.Драздова (па мемуарах М.Набокава) і правядзенне канцэртаў у Міры ды Любчы. Заключным акордам стане выступ, што адбудзецца 8 верасня ў Гродзенскай абласной філармоніі.

Ініцыятарамі правядзення фестывалю выступілі Нацыянальная камісія Беларусі па справах UNESCO, Галоўнае ўпраўленне па культуры, ідэалагічнай рабоце і справах моладзі аблвыканкама, Навагрудскі райвыканкам і музей "Замкавы комплекс "Мір". Мастацкі кіраўнік фестывалю — лаўрэат міжнародных конкурсаў, доктар музычных мастацтваў Юрый Бліноў.

Нагадаем, Мікалай Дзмітрыевіч нарадзіўся ў маёнтку Любча Навагрудскага павета Мінскай губерніі, дзе і прайшлі яго дзіцячыя гады. Музычную адукацыю спачатку атрымаў у кансерваторыях Штутгарта і Страсбурга, а потым прадоўжыў у Сарбоне. Сусветную вядомасць прынесла яму музыка для балета "Мірны саюз".

Мікалай Набокаў праславіўся не толькі як кампазітар — прыкметная яго роля як мастацкага кіраўніка і прапагандыста музычнай культуры: у 1952 г. ён узначаліў "Парыжскі фестываль XX стагоддзя", у 1954-м — Музычны фестываль у Рыме, у 1961 г. — у Токіа, з 1963 па 1968 гг. — у Берліне. На працягу апошніх дзесяці гадоў жыцця быў генеральным сакратаром музычнай секцыі UNESCO ў Парыжы.

Культурны твітар: мы ў свеце

"Пікавая дама" і "...Бельмандо"

Польшча

У Беластоку прайшоў юбілейны, XX Фестываль польскай і беларускай песні "Гродна — Беласток". У ім бралі ўдзел 15 калектываў мастацкай самадзейнасці з Гродзенскай вобласці і Падляшскага ваяводства. Да арганізацыі фэсту спрычыніліся Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы, Маршалкоўскае ўпраўленне Падляшскага ваяводства, кіраўніцтва горада Беластока, Культурны цэнтр Беларусі ў Рэспубліцы Польшча, Генеральнае косульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку.

Расія

На Чарнаморскім узбярэжжы, у Анапе з 14 па 21 верасня пройдзе XXII Адкрыты фестываль краін СНД і Балтыі "Кінашок". У пазаконкурснай праграме будзе прадстаўлена камедыя "Скрасці Бельмандо" (рэжысёр — Мікалай Князеў) сумеснай вытворчасці кінастудыі "Беларусьфільм" і Белтэлерадыёкампаніі.

А месяцам раней, з 19 па 26 жніўня, у той жа Анапе адбудзецца Фестываль Саюзнай дзяржавы "Творчасць юных". У ім возьмуць удзел амаль 130 юных талентаў з розных рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Узрост удзельнікаў — 7 — 18 гадоў. Усе яны — пераможцы нацыянальных і рэгіянальных конкурсаў па вакальным, харэаграфічным, цыркавым, інструментальным ды іншых відах мастацтва.

Літва

Гран-пры Міжнароднага тэатральнага фестывалю "Васара-2013", што праходзіў у Друскеніках, атрымаў Гродзенскі абласны тэатр лялек за спектакль "Пікавая дама". Падводзячы вынікі творчага спаборніцтва, якое праходзіла пад дэвізам "Класіка і XXI стагоддзе", кіраўнік аргкамітэта фестывалю Рымас Тумінас адзначыў "глыбокае і паўнавартаснае супрацоўніцтва тэатраў Літвы, Расіі і Беларусі, іншых духоўна блізкіх краін". Акрамя конкурснай праграмы, на фестывалі адбыўся паказ дыпломных работ студэнтаў тэатральных ВНУ. Працавала рэжысёрская лабараторыя Тумінаса.

Кадр з фільма "Скрасці Бельмандо".

Ізраіль

У Дзяржаве Ізраіль прайшлі Дні культуры Рэспублікі Беларусь. Нашу афіцыйную дэлегацыю ўзначальваў першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Карачэўскі. Канцэртная праграма Дзён складалася з выступленняў Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры" і ансамбля народнага танца "Харошкі". БелТА падрыхтавала для ізраільскіх гледачоў фотавыстаўку "Беларусь сёння".

Фотасюжэт нумара

Грушаўка-арт

Неўзабаве з гісторыяй капліцы Рэйтэнаў здолее пазнаёміцца кожны наведвальнік гэтых мясцін. 18 жніўня стараннямі аўтара артыкула "Герб апошняга з Рэйтэнаў" на стар. 14 Зміцера Юркевіча там будзе ўстаноўлены інфармацыйны шчыт. Падзея адбудзецца ў рамках фестывалю "Дах-XXI", які пройдзе на тэрыторыі сядзібы, спалучыўшы Свята традыцыйнай народнай культуры і праявы сучаснага мастацтва. Арганізатарам імпрэзы выступіў Ляхавіцкі райвыканкам. Тыдзень тут доўжыўся валанцёрскі летнік, які спалучыў пленэр, майстар-класы па традыцыйных танцах для мясцовай дзятвы, а таксама работы па ўпарадкаванні сядзібы. Уваход на імпрэзу — вольны, але гледачы мусяць парупіцца пра тое, каб туды дабрацца. Зрэшты, гэта нескладана: ад Ляхавічаў — усяго якія пару кіламетраў.

Фота Сяргея ЧАРАНОВІЧА

На здымках: фрагменты роспісу і элементаў экстэр'еру сядзібы Рэйтанаў.

Трэба абмеркаваць!

Ці чакаць замежных турыстаў **нашым персанальным музеям?**

Не так даўно ў Маскве адбыўся Першы Форум літаратурных музеяў. Яго эксперты вызначылі дваццаць лепшых музеяў гэтай сферы. "Сусветную зборную", паводле дадзенага рашэння, складаюць музеі Вялікабрытаніі, Германіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Ірландыі, Турцыі, Швецыі, Швейцарыі. У гэтым прэстыжным спісе прадстаўлены таксама Расія і Украіна. Першая — музеямі Пушкіна, Ахматавай, Маякоўскага, Чэхава, Талстога, другая — Літаратурна-мемарыяльным музеем Міхаіла Булгакава ў Кіеве. Беларусь у дваццатку не трапіла. Чаму? Гэтае пытанне мы задалі нашым экспертам.

Уладзімір ГІЛЕП, старшыня Беларускага фонду культуры:

— На жаль, мала ў нас літаратурных ды мемарыяльных музеяў. Нават калі параўноўваць з колішнімі саюзнымі рэспублікамі. Напрыклад, у Грузіі за савецкім часам іх было больш як сто. Мяркую, што зараз менш не стала. У нас жа — каб пералічыць музеі, прысвечаныя асобам, якія годна адзначыліся ў нацыянальнай гісторыі, хопіць пальцаў на дзвюх руках. Нейкія мы занадта сціплыя, калі не можам ці не хочам знайсці ў сваёй мінуўшчыне і рэчаіснасці постацей, вартых ушанавання. Тут бы павучыцца ў расіян, якія здолелі зрабіць свайго нацыянальнага паэта Аляксандра Пушкіна вядомым і шанаваным ва ўсім свеце.

А між тым, нам ёсць чым ганарыцца. Па змесце ды мастацкім афармленні мінскія музеі Купалы і Коласа маглі б сапернічаць з лепшымі мемарыяльнымі музеямі замежжа. У музеях нашых Песняроў шукаюць новыя формы працы з аўдыторыяй, у прыватнасці, з дзецьмі. У Музеі Коласа фактычна створаны падрыхтоўчы клас пачатковай школы — клас з культурным ухілам. Тут дашкольнікі, сярод іншага, знаёмяцца з асновамі краязнаўства.

У тых выпадках, калі не стае свайго досведу, трэба вывучаць замежны. Было б добра, каб нашы музейшчыкі часцей ездзілі па навуку да сваіх калег, і каб гэты абмен вопытам, гэтыя стажыроўкі за дзяржаўны кошт датычыліся не толькі супрацоўнікаў музеяў, так бы мовіць, першага шэрагу, а і ўсёй музейнай супольнасці краіны.

Падсумоўваючы, скажу: каб быць цікавымі для свету, трэба мець уласныя амбіцыі. Калі навучымся паважаць сябе, шанаваць сваё, дык і глядзець на нас будуць іншымі вачыма…

Ілья СВІРЫН, рэдактар аддзела газеты "Культура"

— Будзем шчырымі, у нас бракуе постацей, чыя творчасць мела б гучны міжнародны розгалас. Той жа Булгакаў перакладзены, бадай, на ўсе мовы свету, па ягоных творах здымаюцца фільмы і ставяцца спектаклі. У наяўнасці велізарная цікавасць да творчасці Булгакава, адпаведна — і да ягонага жыцця, а значыць, яго мемарыяльны музей будзе запатрабаваным культурным аб'ектам.

Постацей сусветна вядомых у нас небагата, але яны ёсць. Напрыклад, Адам Міцкевіч. І прысвечаныя яму музейныя комплексы ў Навагрудку ды Завоссі ўяўляюць прыцягальнасць для мясцовай грамады і замежных пілігрымаў. Удалы досвед мемарыялізацыі міцкевічаўскіх мясцін можна распаўсюдзіць на іншыя аб'екты.

Зрэшты, пазітыўныя зрухі назіраюцца ў працы ўсіх літаратурных музеяў Беларусі. Найперш, зразумела, у найбуйнейшых, такіх як Купалаўскі і Коласаўскі, што маюць філіялы, дзе можна ладзіць імпрэзы ды рэалізоўваць культурныя праекты.

Згадваючы Форум у Маскве, варта ўдакладніць тое, якімі крытэрыямі карысталася журы, вызначаючы дваццатку лепшых. І калі мы хочам трапіць у гэты "топ", то мусім улічваць іх у нашай музейнай практыцы. У любым выпадку, рух у беларускай музейнай справе адбываецца. Няма застою, што назіраўся тут яшчэ зусім нядаўна. Звыклымі сталі крэатыўныя праекты, якія нават выходзяць за межы музейнай тэматыкі.

Прапагандуючы сваю культуру, мы сутыкаемся з той акалічнасцю, што нашы класікі звярталіся да сацыяльнай канкрэтыкі, да надзённасці. Інакш кажучы, іх творчасць была, так бы мовіць, засяроджанай на ўнутраных патрэбах нацыі. І праз гэта яна можа быць не надта зразумелай людзям іншых краін.

І яшчэ. У адрозненне ад Шагала ці Суціна, на чыіх імёнах можна грошы рабіць, ад раскруткі іншых постацей беларускай культуры пакуль не варта чакаць істотных дывідэндаў. Патрабуюцца немалыя ўкладанні. І тут нам прыкладам могуць быць палякі. Тамтэйшымі Міністэрствам замежных спраў, Міністэрствам культуры і нацыянальнай спадчыны выдаткоўваюцца грошы на пераклады ды распаўсюджванне польскай літаратуры ў свеце…

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kultura_by!

Вяртаючыся да надрукаванага

Рэклама інтэлектуальнага прадукту

Працягваюць паступаць водгукі на публікацыю "У Беларусі не патрэбны чытальныя залы на вуліцы?". Вось чарговы з іх.

Крэатыўна, сумесна з гараджанамі, працавалі работнікі Бярозаўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы на галоўнай плошчы райцэнтра. Наш прадукт у выглядзе святочнага каравая атрымаўся смачны і карысны. А яскравыя вокладкі кніг-імяніннікі гэтага года паказвалі прысутным дарогу да сталоў запісу, дзе можна было ўзяць дамоў творы дзіцячых пісьменнікаў.

Літаратурныя героі запрашалі на конкурсы, гульні, выстаўкі, адрасныя пляцоўкі. Дзятву і бацькоў здзівіла выстаўка-сюрпрыз "Кніжнае асарці" з кнігамі незвычайнай формы: кніжкі-пазлы, кніжкі-лялькі, кніжкі-тэатры, кніжкі-панарамы, музычныя і гукавыя выданні. Летняя чытальная зала прапанавала часопісы дзесяці найменняў, пазнаваўчую літаратуру, навінкі беларускіх выдавецтваў. Раённая дзіцячая бібліятэка займела на плошчы 25 новых наведвальнікаў.

Акцыя-буккросінг "Вулічная кніжная паліца" прапанавала больш за сто выданняў для абмену і ў падарунак. Упершыню ў людным месцы пакінута пяць уласных кніг для таго, каб кнігалюб знайшоў іх, прачытаў і перадаў іншаму. Па хатніх бібліятэках разышлося 80 кніг. Попытам карысталіся мастацкая літаратура, "жаночыя" раманы, кнігі па шахматах і рыбнай лоўлі.

Бібліятэкары-ўмельцы захапілі дзяцей і матуль майстар-класам па стварэнні рукачыннай прыгажосці праз шклаграфію ды пляценне з папяровай лазы. Гульнёвы куток прапанаваў развіваючыя гульні.

Дошка водгукаў запоўнілася словамі падзякі дарослых і дзяцей за змястоўны нядзельны адпачынак з кнігай і бібліятэкай на адкрытым паветры. Нават госці Бярозы з гарадоў-мегаполісаў адзначылі каштоўнасць мерапрыемства, гасціннасць яго арганізатараў, праявы ўвагі бібліятэкараў да кожнага дзіцяці, якое наведала свята кнігі. І сямейны бюджэт пры гэтым не панёс ніякіх страт!

Мараль паведамлення простая: калі не сядзіш склаўшы рукі, ідзеш да людзей, рэкламуеш свой інтэлектуальны прадукт, прывучаеш жыхароў да кнігі праз навізну формы, будзеш мець і "дывідэнды": пазітыўны імідж, зваротную сувязь, творчае супрацоўніцтва з чытачом, новых наведвальнікаў, асалоду ад прыдуманага ды здзейсненага.

Ала ДРАГАН,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бярозаўскай ЦРБ

Дзяжурны па нумары

А ўся справа — у скрынцы?..

Яўген РАГІН,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

Я зноў пра бібліятэкі ды бібліятэкараў. І пачну здалёк: з веткаўскага дзяцінства. У класе пятым-шостым я быў запісаны ў дзве бібліятэкі: школьную і дзіцячую. А хацелася яшчэ — і ў дарослую. Урэшце, дапамагла маці-настаўніца: мяне "па блаце" запісалі і туды. Па сёння памятаю сваё вялікае расчараванне: у дарослай, сярод сур'ёзных паліц з сур'ёзнымі фаліянтамі, мяне, падшыванца, чакала... драўляная скрынка з тонкімі "садаўскімі" выданнямі, змест якіх я ведаў ужо на памяць. А далей скрынкі бібліятэкарка не "пушчала": забаранялася апошнімі інструкцыямі райана. А, не дай Бог, штосьці не тое вычытае, а раптам чагосьці не дацяміць, а калі не пра тое думаць пачне... Праз які тыдзень, з плачам і енкам, я ўсё ж вырваўся за межы скрынкі і вычытаў не тое, і не ўсё дацяміў, і думаць пачаў не так, але адкрыў для сябе Свет, у якім і сёння пачуваю сябе паўнавартасным грамадзянінам з непахісным правам на вальнадумства ды крытычнае асэнсаванне з'явы, падзеі, факта. Вельмі шкада, што ключ да гэтага Свету мне дала не бібліятэкарка, якая так і засталася паслугачкай "скрынкі", дзе апрача састарэлых ды нецікавых дагматаў нічога не было. Вось у такіх бібліятэчных "скрынках" уся і справа.

Дзіўна, але ў кнігарнях 80-х менавіта ў такіх скрынках (хто памятае?) прадаваліся вершаваныя зборнікі кішэннага фармату. Мы называлі іх "брацкімі могілкамі" і куплялі-ратавалі адтуль "нефарматных" Акуджаву, Самойлава, Ваншэнкіна, Друніну, Каржавіна... Але гэтыя скрынкі — зусім іншага кшталту. Яны самі па сабе — Свет...

Прайшлі гады. Зніклі скрынкі. Але бібліятэчныя дагматы засталіся. Так, яны — іншыя. Але ад іх па-ранейшаму, даруйце, "патыхае пылам". Скрыняў няма, усё дазволена, аднак няма галоўнага — "прафесійных" чытачоў. Як можа прывіць павагу і любоў да Слова чалавек, які сам яго не любіць? Часу няма: каталагізацыя, улік, спісанне... Да павуціння паміж стэлажамі яшчэ не дайшло, але дзяцей цяпер і пугай да кніг не падгоніш (калі гэта, натуральна, не праграмная літаратура). Легендарная "Вёска" Андрэя Федарэнкі стаіць на вясковых стэлажах некранутай...

Безумоўна, пугай не варта — толькі любоўю і павагай. Але гэтаму на бібліятэчных факультэтах не вучаць. Тым больш, калі ты прыйшоў працаваць бібліятэкарам з фермы, бытавога абслугоўвання ці з крамы. Адна з нашых сельскіх бібліятэкарак прызналася не для друку: самыя актыўныя чытачы — пастухі і начныя вартаўнікі мясцовага СВК. Менавіта яны наведваюць бібліятэку штотыднёва. Школьнікі ж гэта робяць пад прымусам праграмы. Пенсіянеры збольшага чытаюць толькі газеты. А чытацкая "павальная" актыўнасць — толькі "фармулярная".

> Да павуціння паміж стэлажамі яшчэ не дайшло, але дзяцей цяпер і пугай да кніг не падгоніш (калі гэта, натуральна, не праграмная літаратура). Легендарная "Вёска" Андрэя Федарэнкі стаіць на вясковых стэлажах некранутай...

Так, у сельскіх бібліятэках нецікава. Сябра-журналіст, заўзяты чытач, пасля некалькіх дзён сумеснай камандзіроўкі катэгарычна адмаўляецца заходзіць у сельскія бібліятэкі: маўляў, паўсюль адно і тое ж. І ён мае рацыю. Я таксама хачу заходзіць у бібліятэку, дзе мяне чакаюць сябры ды аднадумцы...

Знаёмая супрацоўніца мінскай бібліятэкі выкарыстала прэмію для паездкі да маскоўскіх калег. Расказвала, як да чытачоў прыходзяць папулярныя літаратары кшталту Захара Прылепіна ці Уладзіміра Сарокіна, якія дэбаты вядуцца пра будучыню расійскай славеснасці, як гэта ўсё цікава і змястоўна...

Так нашым бібліятэкам не стае дзеі. Не сумных гутарак з графаманамі, не безнадзейных выставак антыалкагольнай літаратуры, а ўчынкаў, акцый, праектаў, словам, — выхадаў у народ... Я вельмі хачу пабываць у рыжскай бібліятэцы, якую адкрыў Міхаіл Задорнаў. Кажуць, кожная паліца ўстановы мае ўказальнік, што менавіта гэтыя кнігі чытае канкрэтны сябар сатырыка: артыст, літаратар, палітык... Лепшай рэкламы для ўласнага чытання не прыгадаць. Мы неаднаразова прапаноўвалі беларускім сельскім бібліятэкарам выкарыстаць ідэю і пазначыць на стэлажы: "Мае любімыя кнігі". Ніхто не спяшаецца. Як вы думаеце, чаму?..

Рэакцыя на рэдакцыю

Яшчэ раз аб Калі казаць пра Права журналіста

Рэдакцыя атрымала ліст ад кіраўніцтва і творчых супрацоўнікаў студыі "Летапіс" у якасці водгуку на публікацыю "Якія плюсы і мінусы ўваходжання "Белвідэацэнтра" ў структуру "Беларусьфільма"?". Прыводзім яго разам з рэдакцыйным каментарыем.

"Апошнім часам у публікацыях вашай газеты мы заўважылі неаб'ектыўна-павярхоўны погляд на дакументальнае кіно, што ствараецца на студыі "Летапіс" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". Размова не ідзе пра вызначэнне мастацкіх вартасцей фільмаў, кожны аўтар мае на гэта бясспрэчнае права, але аб відавочных фактах. Не з'яўляецца выключэннем і артыкул "Якія плюсы і мінусы ўваходжання "Белвідэацэнтра" ў структуру "Беларусьфільма"?", дзе кінакрытык Антон Сідарэнка, увогуле не згадваючы студыю "Летапісу", робіць нечаканую і дзіўную выснову:"... Асноўныя высілкі "Беларусьфільма" сканцэнтраваны на вытворчасці ігравых стужак". Гэта аніяк не адпавядае рэчаіснасці: вытворчасць дакументальных фільмаў на студыі "Летапіс" — адзін з важных складнікаў усёй кінавытворчасці кінастудыі. Нагадаем, студыя "Летапіс" з'яўляецца найстарэйшым вытворцам дакументальнага кіно ў Беларусі, якое вядзе адлік з 1925 года. Пад брэндам "Летапісу" як творчага аб'яднання Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" беларуская дакументалістыка існуе з 1968 года. Дзякуючы ўдзелу ў міжнародных кінафестывалях ды шматлікім прызам кінафорумаў, у тым ліку і самых прэстыжных, беларускае дакументальнае кіно ведаюць ва ўсім кінематаграфічным свеце. Пра ніякую няроўнасць у параўнанні з мастацкім кіно размова не ідзе і ніколі не будзе ісці.

Якія плюсы і мінусы
уваходжання "Белвідэацэнтра"
у структуру "Беларусьфільма"?
Абновы Здраўнёва
Магілёў, які
чытае пад парасонам

За апошнія паўтара года 26-цю прызамі і ўзнагародамі міжнародных кінафестываляў адзначаны 14 дакументальных фільмаў студыі "Летапіс". Калі браць колькасць стужак, якія былі ўключаны ў конкурсныя праграмы кінафестываляў, то лічба будзе ўдвая большая. Напрыклад, фільм рэжысёра Кацярыны Махавай "Званар" браў удзел у 10 кінафестывалях, на шасці з іх атрымаў прызы ды ўзнагароды, у тым ліку і Гран-пры. Стужка Вольгі Дашук "Кінааматар. Восеньскі сон" удзельнічала ў 9 прэстыжных кінафорумах, на чатырох з якіх адзначана ўзнагародамі. Геаграфія кінафестываляў — самая шырокая: Беларусь, Польшча, Расія, ЗША, Германія, Грэцыя, Чарнагорыя, Эстонія, Бразілія. І такія прыклады можна доўжыць. Таму выклікае здзіўленне сваёй недасведчанасцю пасаж другога ўдзельніка таго ж матэрыялу ў газеце — кінарэжысёра Андрэя Куцілы аб тым, што кінастудыя не займаецца "прамоўшнам уласнай прадукцыі на фестывалях, у прэсе". Згадайма апошні знакаміты фестываль у Канах, дзе ўпершыню за ўсю гісторыю кінафэсту ў "Кутку кароткага метра" былі прадстаўлены чатыры фільмы студыі "Летапіс": "Пячнік" Алы Вольскай, "Асобы тэатр.

Каментарый ад рэдакцыі

Рубрыка "Трэба абмеркаваць!" створана адмыслова для таго, каб выклікаць інтарэс да найбольш злабадзённых пытанняў развіцця айчыннай сферы культуры. Прызнаемся, пасля апублікавання каментарыяў Андрэя Куцілы і Антона Сідарэнкі мы чакалі рэакцыі. Але былі здзіўлены аргументацыяй ліста кіраўніцтва студыі "Летапіс".

Далучэнне "Беларускага відэацэнтра" да структуры Нацыянальнай кінастудыі — працэс складаны і, зразумела, вымушаны. Таму не дзіва, што нашы эксперты выказалі шкадаванне аб знікненні самастойнай адзінкі ў сферы нацыянальнага кіно. Прычым — відавочна канкурэнтаздольнай, прынамсі, у творчых адносінах. Але прыведзеныя імі аргументы датычыліся непасрэдна БВЦ і Нацыянальнай кінастудыі, у склад якой "Белвідэацэнтр" (як плануецца) увойдзе ў якасці асобнага падраздзялення. Таму ліст і рэакцыя з боку менавіта кіраўніцтва "Летапісу" выглядае празмернай: працэс зліцця БВЦ з "Беларусьфільмам" да студыі "Летапіс" дачынення не мае, пра што, урэшце, і пазначана ў пісьме. Ды і ў культураўскім матэрыяле пра тое, натуральна, не гаварылася. Ці не так?

Падкрэслім, што гэтая паралель нават не правамерная: рэдакцыя не імкнулася параўнаць прадукцыю студый — вызначыць лепшых і горшых, а звярнула ўвагу, паўторымся, на факт рэформы і яе магчымыя наступствы ў плане страты канкурэнтнага асяроддзя. Таму і было вырашана звярнуцца па каментарый да спецыялістаў, якія не з'яўляюцца ў гэтай сітуацыі, карыстаючыся юрыдычным тэрмінам, "зацікаўленымі асобамі": ні Антон Сідарэнка, ні Андрэй Куціла да "Белвідэацэнтра" ці да Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" дачынення не маюць.

Калі ўсё ж браць да ўвагі папрокі ў неаб'ектыўным стаўленні газеты да ўдзельнікаў кінематаграфічнага працэсу, хочацца сказаць наступнае.

Нацыянальны кінематограф заўсёды быў у сферы інтарэсаў нашага выдання. Больш за тое, бяромся сцвярджаць: больш і глыбей, чым газета "Культура", пра нацыянальны кінапрацэс не пісала і не піша не адно айчыннае СМІ. Зрэшты, менавіта за аўтарствам нашага пастаяннага аўтара Антона Сідарэнкі выходзілі грунтоўныя аналітычныя матэрыялы пра розныя аспекты развіцця як айчыннай дакументалістыкі, так і кінематографа ў цэлым. Яны ніколі не сустракалі папрокаў у "заангажаванасці".

Неігравое кіно набірае моц і атрымлівае вялікую аўдыторыю ў гледачоў усяго свету. Аднак нам вельмі хацелася б, каб у аўтараў ды экспертаў беларускіх СМІ было як мага больш інфармацыйных нагод пісаць пра дасягненні айчынных дакументалістаў. Было б няблага, каб пра гэтыя дасягненні рэдакцыя даведвалася не толькі з эмацыйных лістоў адміністрацыі, а і з **рэгулярных** прэс-рэлізаў, адпаведных блогаў, **актыўных** старонак у сацыяльных сетках, якія абнаўляюцца **штодзённа** (здымачны ж працэс і сапраўды няспынны!), а не, як кажуць, гады ў рады. Урэшце, спосабаў можа быць мноства.

кінапрамоўшне

У пошуках шчасця" Кацярыны Махавай, "Забраны край" Юрыя Цімафеева і "Аксана Волкава. A prima vista" Наталлі Жамойдзік. Фільмы гэтыя выклікалі вялікую цікавасць прафесіяналаў.

Актыўна працуе кінастудыя "Беларусьфільм" з дакументальнымі фільмамі і дома, у Беларусі. Акрамя клуба дакументальнага кіно, які штомесяц праводзіцца ў кінатэатры "Цэнтральны" і дзе адбываюцца прэм'еры практычна ўсіх стужак "Летапісу", апошнім часам стала нормай практыка буйных прэм'ер для грамадскасці. Такія значныя прэм'еры адбыліся ў Гомельскім цырку ("На манежы сёння і заўжды" маладога рэжысёра Ігара Чышчэні), у Музеі Якуба Коласа ("У пошуках новай зямлі" рэжысёра Яўгена Сяцько), у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ("Семдзясят пятая восень Андрэя Мдзівані" Міхаіла Жданоўскага), у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ("Беларусь. Чатыры гады вайны" Яўгена Сяцько), у Міністэрстве замежных спраў ("Беларуская дыпламатыя. Першы міністр" рэжысёра Сяргея Агеенкі). Штогод нацыянальныя прэм'еры дакументальных фільмаў студыі "Летапіс" праводзяцца ў рамках Міжнароднага кінафестывалю "Лістапад". Нашы дакументальныя фільмы заўсёды ўдзельнічаюць у Днях беларускай культуры ў замежных краінах, актыўна дэманструюцца на беларускіх тэлеканалах.

Не можам паскардзіцца і на ўвагу да дакументальнага кіно з боку прэсы. Сталася добрай традыцыяй ініцыятыва студыі "Летапіс" на пачатку года рабіць своеасаблівую справаздачу аб сваёй дзейнасці за год і ладзіць прагляды ўсіх створаных фільмаў для журналістаў, кінакрытыкаў і мастацтвазнаўцаў. Нашы фільмы выклікаюць вялікі розгалас у газетах і часопісах, мы цэнім меркаванні неабыякавых і зацікаўленых людзей, якія дазваляюць аб'ектыўна ацаніць тое, што зроблена. На гэтых праглядах рэгулярна бывае і адзін з аўтараў згаданага матэрыялу Антон Сідарэнка, пасля з'яўляюцца на старонках газеты "Культура" яго рэцэнзіі і матэрыялы... Таму ігнараванне аўтарам фактаў выклікае здзіўленне і наводзіць на думку не проста аб прыватным меркаванні, што магчыма, але аб свядомай неаб'ектыўнасці і заангажаванасці, калі размова ідзе пра двух вытворцаў кінадакументалістыкі — "Белвідэацэнтр" і студыю "Летапіс", дзе перавага падкрэслена аддаецца першаму з іх. Такая заангажаванасць прыкметная і ў ранейшых публікацыях кінакрытыка. Чым жа яшчэ можна патлумачыць з'яўленне ў адной з іх лічбы ўдзелу і адзінак фільмаў "Белвідэацэнтра" ў 122 (!) міжнародных кінафестывалях? Міністр культуры двума тыднямі пазней у сваім справаздачным дакладзе аб дзейнасці Міністэрства за год быў больш сціплым і назваў лічбу — 86 фестываляў. Гэта датычылася ўсіх відаў кіно: мастацкага, дакументальнага, анімацыйнага.

Калі яшчэ гаварыць аб прамоўшне, то кожная значная падзея, звязаная з дакументальным кіно, знаходзіць адлюстраванне ў прэсе, а таксама ў сюжэтах навін культуры беларускіх тэлеканалаў. Дастаткова проста зайсці на сайт Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", каб валодаць інфармацыяй, а не выдаваць на старонках газеты беспадстаўныя высновы. Дзіўна, што такім даступным рэсурсам не карыстаецца вопытны журналіст.

Што тычыцца далучэння "Белвідэацэнтра" да Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", то гэтае рашэнне не належыць да кампетэнцыі кінастудыі і размова не ідзе аб сіле ці слабасці аргументаў кожнага з аўтараў матэрыялу, а аб відавочным. Адно можна сцвярджаць: "Белвідэацэнтр" на кінастудыі захаваецца як асобная студыя, будзе працягваць выконваць свае больш прыкладныя функцыі кінадакументалістыкі. Асноўныя ж задачы студыі "Летапіс" застаюцца ранейшымі: плённа захоўваць і развіваць слаўныя традыцыі беларускага дакументальнага кіно, захоўваць чысціню дакументальнага кіно як з'явы мастацтва, падтрымліваць і далучаць да кінавытворчасці маладых таленавітых аўтараў, захоўваць лепшыя кадры рэжысёраў-дакументалістаў.

Мы не настойваем на публікацыі гэтага ліста, бо справа не ў абароне рэпутацыі студыі "Летапіс". Таму можна было б і не рэагаваць на падобныя публікацыі, але нас найперш хвалюе лёс беларускага дакументальнага кіно, яго шляхі развіцця. Падзел на тое, што зроблена адным вытворцам, і на тое, што зроблена іншым, — няплённы, штучны і не карысны для справы. Мяркуем, што наш пункт гледжання будзе ў далейшым улічвацца ў матэрыялах вашай газеты.

З павагай,
дырэктар студыі "Летапіс"
Л.Л. Баталава,
вядучыя рэдактары
І.М. Дзям'янава, У.В. Мароз"

піяр. (НЕ)ІНЕРТНЫ

Зрэшты, "К" заўсёды адкрытая для абмеркавання працэсу развіцця беларускай дакументалістыкі. Прапануем усім ахвотным давесці свае погляды на праблемы любымі спосабамі. Верагодна, тады зацікаўленая ў развіцці айчыннай дакументалістыкі грамадскасць здолее зняць пытанні накшталт таго, чаму вядучыя аўтары нашай краіны ўсё часцей аддаюць перавагу супрацоўніцтву з недзяржаўнымі і нават замежнымі студыямі, а таксама паведамляюць (зразумела, у прыватных размовах) пра тое, што вымушаны адпраўляць дыскі са стужкамі на фестывалі за свой кошт.

Калі казаць пра ўзаемадзеянне з прэсай (а значыць, з грамадствам наогул), то менавіта дзейнасць "Беларускага відэацэнтра" і яго супрацоўнікаў у мінулыя два гады можа лічыцца ўзорнай. Ці варта спрачацца, што справы выглядаюць менавіта так? Спадзяёмся, пасля далучэння БВЦ да Нацыянальнай кінастудыі рэдакцыя "К" не будзе звяртацца непасрэдна да аўтараў дакументальных стужак і "Летапісу", і "Белвідэацэнтра", каб знайсці суправаджальную інфармацыю і кадры з фільмаў. Спадзяёмся таксама, што карэспандэнты выдання змогуць па меры неабходнасці прысутнічаць на рэгулярных прэс-паказах свежых дакументальных стужак, а да ўсяго — атрымаюць каардынаты супрацоўніка, што адказвае за кантакты са сродкамі масавай інфармацыі. Бо львіная доля інфармацыйнай працы, што, мабыць, і зразумела, на "Беларусьфільме" вядзецца менавіта ў кірунку іграваога кіно. Пэўна, менавіта гэтая акалічнасць і дазволіла аднаму з нашых экспертаў зрабіць выснову аб тым, што *"асноўныя высілкі "Беларусьфільма" сканцэнтраваны на вытворчасці іграваых стужак"*.

Безумоўна, інфармацыі пра ўдзел і перамогі аўтараў ды стужак "Летапісу" ў міжнародных кінафестывалях на старонках "К" стане больш. Але ж пры адной умове: звесткі мусяць своечасова трапляць у рэдакцыю (нашу, дый любую іншую), так, як гэта адбываецца цяпер з інфармацыяй пра дзейнасць БВЦ: абвесткі, трэйлеры, плакаты, запрашэнні на прэм'еры і здымкі... Так, журналіста, як і таго воўка, кормяць ногі ў здабыванні інфармацыі. Але ж чаму б не запрасіць прэсу на прагляд няхай нават і фрагментаў рабочага матэрыялу, чаму не правесці сустрэчу з героем будучай стужкі ці не прапанаваць, як тое рэальна робіцца на пляцоўцы іграваога фільма, рэпартаж са здымачнай пляцоўкі?

Уся справа тут, на жаль, упіраецца ў інертнасць тых, хто мае дачыненне да піяру будучай ці нават ужо адзнятай карціны. А інертны піяр выніку не прыносіць, асабліва ў тым выпадку, калі мы кажам пра дакументалістыку, якая, на вялікі жаль, усё яшчэ не мае ні асобнага кінатэатра, ні хоць бы рэгулярных сеансаў. Пакуль жа айчыннае даккіно найбольш рэальна пабачыць на канале "Беларусь 3". І значную частку сваёй прадукцыі ў тэлеэфіры названага канала "Белвідэацэнтр" (а на дзень і сапраўды выходзіць не адна і не дзве стужкі пад гэтым брэндам) піярыць праз тыя ж сацыяльныя сеткі паралельна з анонсамі самога канала, у тым ліку і сеціўнымі. Дык мо практыку варта пераняць і "Летапісу"? Усё ж гэта — сусветная практыка, лічы, бясплатнай дзейснай рэкламы.

на ангажаванасць. Фактам!

І яшчэ. Пагадзіцеся, фестывальная статыстыка трапляе ў рукі карэспандэнтаў выдання (як і ў Міністэрства культуры, дарэчы) толькі праз афіцыйных прадстаўнікоў кінавытворцы. Вызначыць адзіны крытэрый ацэнкі — сапраўды справа мэтазгодная, каб унікнуць разыходжанняў у лічбах не ў такой ужо і шырокай кінапрасторы Беларусі.

Такім чынам, праўдзівая і поўная інфармацыя з афіцыйных крыніц — найлепшы сродак пазбегнуць крыўд, непаразуменняў ды папрокаў. Аргументаваная прапанова для канструктыўных дзеянняў, ці не так?..

З павагай,
рэдакцыя газеты "Культура"

На маю думку...

Няма моды на новае

Аляксандр БАГДАНАЎ,
канцэртны прадзюсар

У мяне ўсё часцей узнікае пытанне: чаму самыя папулярныя вечарыны або канцэрты на Беларусі — гэта "рытмы 70-х — 80-х", а з нядаўняй пары — і 90-х? Ва ўсіх самых модных клубах па начах ладзяцца рэтра-паці, а ўвечары там граюць кавер-бэнды, якія выконваюць замежныя хіты 30-гадовай даўніны. Тое ж самае датычыцца і канцэртнага жыцця: лепш за ўсё ў нас ідуць на тых зорак, якія пачалі сваю кар'еру некалькі дзесяцігоддзяў таму. І ўсё б нічога, каб цікавасць да нейкіх новых тэндэнцый у музыцы не мела адваротны характар.

Было б цалкам зразумела, каб рэтра-вечарыны збіралі толькі салідных дзядзькаў, якія прыйшлі панастальгіраваць па незваротна страчанай маладосці. Але ж на "дыска 80-х" у клубы набіваецца васямнаццацігадовага ўзросту моладзь! Гэтых людзей ніколі не пабачыш на канцэрце іх аднагодкаў, якія граюць прасунутую музыку, што існуе тут і зараз. Здавалася б, у такім веку трэба шукаць нейкія новыя музычныя ўражанні, а не спыняцца на тым, што ўжо даўно пройдзена ды "ператраўлена"...

> Было б зразумела, каб рэтра-вечарыны збіралі толькі салідных дзядзькаў, якія прыйшлі настальгіраваць па страчанай маладосці. Але ж на "дыска 80-х" у клубы набіваецца васямнаццацігадовага ўзросту моладзь! Чаму?

Але калі прывозім у Мінск неймаверна цікавую замежную каманду, якая выконвае ўнікальную музыку, напрыклад, у стылі электраджаз, ды на Захадзе выступае ледзь не на стадыёнах, тут на яе прыходзіць якіх трыццаць-сорак чалавек. Дый тая ж наша "Серебряная свадьба" збірае ў Германіі вялікія залы, у Маскве на яе ходзяць і панкі, і бізнесмены, бо яна ўспрымаецца там, па сутнасці, як музыка для ўсіх, а ні ў якім разе не як нейкі "андэграўнд". У нас жа гэты "аркестр" паранейшаму папулярны выключна ў вузкім коле, сярод сваёй уласнай аўдыторыі. Бо наша публіка не прагне пошуку нечага новага — яна заўсёды абірае пратаптаны мінулымі пакаленнямі шлях. Вядома, гэта куды прасцей, бо і шукаць не трэба, але... куды менш цікава.

У чым жа прычына такога кансерватызму? Думаецца, тут знайшлася б не адна тэма для даследаванняў у розных галінах навук, бо, прааналізаваўшы сітуацыю, можна выявіць цэлы букет самых розных фактараў. Але асабліва я хацеў бы спыніцца на ролі мас-медыя.

Безумоўна, густы людзей шмат у чым фарміруе так званы радыёфармат. А нашы FM-станцыі круцяць менавіта "праверaную" музыку. Калі яе слухаеш, не заўсёды можна дакладна вызначыць, якога стагоддзя тая або іншая песня. Дык адкуль тады аўдыторыя можа зразумець, што музычныя тэндэнцыі маюць схільнасць развівацца, і што ў свеце за апошнія дваццаць гадоў з'явілася шмат цікавага?

Зразумела, адной толькі дыягностыкі гэтай сітуацыі будзе замала — трэба рабіць нейкія канкрэтныя крокі. Не так даўно мы запусцілі ўласнае інтэрнэт-радыё, якое цэлымі суткамі круціць актуальны сусветны музычны кантэнт. Дамаўляемся з рознымі месцамі ў Мінску, каб яно там пастаянна транслявалася. Можа, да нейкіх кардынальных зрухаў у свядомасці масавай аўдыторыі гэта і не прывядзе, але... Як кажуць, вада камень точыць.

Мана і праўда пра Манюшку

Верная "зачэпка" музычнага дэтэктыва

Творчасць і само імя Станіслава Манюшкі згадваецца ў Беларусі, дзе ён нарадзіўся ды працаваў да ад'езду ў Варшаву, усё часцей. Адрадзіўся конкурс вакалістаў "Убельская ластаўка", прысвечаны яго музыцы. Сталічны тэатр "Галерэя" пры Палацы культуры прафсаюзаў паставіў яго аднаактовую лірыка-камічную оперу "Слова гонару". У Інтэрнэце ідзе збор подпісаў на адкрыццё кампазітару помніка (далучайцеся да гэтай акцыі!). З'явілася ў нас і сур'ёзная даследчыца творчасці Манюшкі — кандыдат мастацтвазнаўства Святлена НЕМАГАЙ.

Святлена Немагай з дачкой Агатай.

Выхаванка, а цяпер малодшая калега доктара навук, прафесара Вольгі Дадзіёмавай, яна вядомая як аўтар грунтоўнай манаграфіі пра Міхала Клеафаса Агінскага і, шырэй, як галоўны спецыяліст у краіне (і ва ўсім свеце) па музыцы Беларусі XIX стагоддзя. У 2009 годзе яна правяла некалькі месяцаў у польскіх і літоўскіх бібліятэках, зрабіўшы копіі ўсяго, што мела дачыненне да нашай культуры. І зараз, знаходзячыся ў дэкрэтным адпачынку (сыну Багуславу — два, дачцы Агатцы ўзімку будзе чатыры гады), паралельна займаецца даследаваннем. Вынік — разбурэнне многіх стэрэатыпаў і памылак, звязаных з творчасцю Манюшкі. Кнігу пра яго яна плануе выдаць да 200-годдзя з дня нараджэння кампазітара, якое будзе ў 2019-м. А налета запланаваны шэраг яе артыкулаў, у тым ліку да прэм'еры оперы "Галька" ў нашым Вялікім тэатры. Першымі ж пра многія навуковыя знаходкі даведаюцца чытачы "К".

— Адзін са стэрэатыпаў — успрыняцце Манюшкі як адно польскага кампазітара — ужо зняты. Дый стаўленне да яго ранняга "беларускага" перыяду (дакладней, віленска-мінскага) стала больш паважлівым…

— Насамрэч, даследаванне гэтага перыяду дазваляе ўвогуле пераставіць акцэнты ва ўсёй творчасці кампазітара. Лічыцца, што ягоная музыка — пераважна лірыка-драматычнага кірунку. Але гэта справядліва толькі ў дачыненні да польскага перыяду. Калі ж аглядаць усю музычна-тэатральную спадчыну Манюшкі, дык аказваецца, што лірыка-камічных твораў было значна больш. І гэта не выпадкова! Высокія жанры ў Расійскай імперыі культываваў царскі двор. А на нашых тэрыторыях у той час склалася адметная сітуацыя, калі свецкае мастацтва выступала ў якасці гэткага "забаўляльнага канала". Шматлікія антрэпрызныя трупы былі змяшанымі — оперна-драматычнымі. Таму запатрабаванымі былі адпаведныя творы — з музыкай, спевамі, танцамі і размоўнымі дыялогамі.

Пачаўшы іх даследаваць, я адчула сябе ледзь не дэтэктывам. Возьмем, да прыкладу, вадэвіль "Канторшчыкі". Польскі дырыжор і кампазітар Густаў Рагускі яшчэ ў 1910 годзе назваў гэты твор першым у тэатральнай творчасці Манюшкі, а таму даволі кепскім і слабым. І ўвогуле, маўляў, гэта не цэлая партытура, а толькі яе фрагмент. Сапраўды, усяго дванаццаць старонак — здавалася б, малавата. Але ў гэты аб'ём укладзены шэсць вакальных нумароў: песні дзеючых асоб, дуэт і фінальны нумар, дзе героі спяваюць па куплеце. Гэта і ёсць увесь твор цалкам. І ніякі ён не слабы! І, да ўсяго, зусім не першы!

— Чаму ж ранейшыя даследчыкі памыляліся? Пэўна, была для таго падстава?

— Яны зыходзілі з таго, што на партытуры пазначаны 1832 год. Манюшку на той час было ўсяго трынаццаць: маўляў, ці ж мог быць у такім узросце сапраўдны прафесіяналізм? Звычайна ж як здараецца: хтосьці адзін штосьці напісаў — і ўсе астатнія, спасылаючыся на яго, тыражуюць гэта ў шматлікіх выданнях, у тым ліку такіх аўтарытэтных, як энцыклапедычныя. Так і тут атрымалася. Але ніхто чамусьці не звярнуў увагу на тое, што год дапісаны зусім не манюшкаўскай рукой, а кімсьці іншым! Не менш цікавая дэталь звязана з лібрэта. П'еса належыць Фрыдэрыку Скарбку — чыноўніку, які, тым не менш, займаўся і літаратарствам, а яшчэ быў хросным бацькам Шапэна. П'еса з 1829 года ставілася ў Варшаве і Кракаве, але надрукавана была толькі ў 1834-м. Дык як і праз каго мог 13-гадовы хлопчык атрымаць тое лібрэта, пакуль яно не было выдадзена? Гэта нерэальна.

— Можна, канешне ж, пажартаваць, што хіба праз Інтэрнэт, калі там хтосьці выклаў гэтую п'есу. А вы не высвятлялі, дарэчы, з чыёй музыкай ішоў той спектакль?

— Невядома. Я знайшла партытуру, але яна без імені аўтара. І гэта, зразумела, зусім іншыя ноты, не манюшкаўскія. У іх цалкам вытрыманы аўтарскія рэмаркі, пазначаныя ў лібрэта, што тыя або іншыя вершы "спяваюцца на матыў" якойсьці песні, папулярнай у той час. Манюшка ж выкарыстаў толькі адну прапанаваную Скарбкам тэму — "Ах, мой мілы Аўгусцін". Уся астатняя музыка — арыгінальны матэрыял самога Манюшкі. Прычым відавочная прафесійная кампазітарская праца, бо першы ды апошні нумары звязаны паміж сабой інтанацыйна. І гэта не проста паўтор адной і той жа мелодыі, а своеасаблівыя "варыяцыі на тэму", падуладныя прафесіяналу.



> "Пачаўшы даследаваць Манюшку, адчула сябе ледзь не дэтэктывам. Скажам, знайшла партытуру, але яна без імені аўтара. І гэта зусім іншыя ноты, не манюшкаўскія. А чые?"

— Але ж няўжо няма ніякіх звестак пра "Канторшчыкаў" з музыкай Манюшкі ў тагачаснай прэсе, у ліставанні кампазітара?

— Пакуль не знайшла. Таму казаць пра нейкія пастаноўкі гэтага манюшкаўскага вадэвіля не даводзіцца. Што ж да лістоў, напісаных ці атрыманых кампазітарам, дык прамыя згадкі гэтай назвы там таксама не сустракаюцца. Але ж ёсць адна верная "зачэпка"! У 1843 годзе Манюшка піша цешчы, што за тры дні стварыў вадэвіль, даволі вясёлы (маўляў, "гучыць весела"), акцёры яго ўжо развучваюць і мае ён быць выкананы ў Мінску на бенефіс Яна Хэлмікоўскага. Назва не пазначана, і польскія даследчыкі вырашылі, што мелася на ўвазе "Латарэя", напісаная таксама ў 1840-я. Але ж "Латарэя" ўяўляе з сябе вялізную партытуру, яна не магла быць створана ўсяго за тры дні. А вось "Канторшчыкі", як кажуць у такіх выпадках, — без праблем.

— "Латарэя" ставілася некалькі гадоў таму ў Малой зале імя Рыгора Шырмы сіламі Ансамбля салістаў "Класік-Авангард", Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі ды салістаў-энтузіястаў. І пазіцыянавалася як опера! Але ў ёй шмат размоўных дыялогаў, прычым даволі разгорнутых, і гэтым яна нагадвае нават не столькі ўласна камічную оперу, колькі — вадэвіль. А як вызначаеце жанр вы?

— З жанрамі музычна-тэатральных твораў Манюшкі — асобная загадка. На партытуры, выдадзенай у 1908 годзе, ужо пасля смерці кампазітара, "Латарэя" пазначана як "фрашка", што перакладаецца як "драбніца, пусцяковіна". Гэты тэрмін быў распаўсюджаны ў Польшчы напрыканцы XIX — на пачатку XX стагоддзя, але ён, падобна на тое, таксама не належыў Манюшку. Увогуле ж, усе такія творы віленска-мінскага перыяду спалучаюць у сабе, толькі ў рознай прапорцыі, рысы оперы і вадэвіля. На некаторых тагачасных афішах, дарэчы, так і пісалі: опера-вадэвіль. У залежнасці ад прапорцый, некаторыя, як тая ж "Латарэя", аказваюцца ўсё ж бліжэйшымі да оперы, іншыя ж, як "Карманьёл", — да вадэвіля. А ёсць яшчэ і такое азначэнне жанру — аперэтка, якое ўжываў і сам кампазітар. Заўважу, гэта ні ў якім разе не аперэта ў яе класічным разуменні! Хаця перакладаюцца абодва словы аднолькава: "маленькая опера".

— Ды ўсё ж нейкай агульнай тэндэнцыяй з'яўляецца паварот у бок лірыка-камічных твораў, а не "высокіх трагедый". Дарэчы, з такім жа лірыка-камічным ухілам былі і творы Уршулі Радзівіл у XVIII стагоддзі, яна нават старажытнагрэчаскі міф умудралася зрабіць са шчаслівым фіналам. Такія ж п'ескі пісаў і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, з якім Манюшка сябраваў ды плённа супрацоўнічаў…

— Наконт супрацоўніцтва, здаецца, ёсць перабольшанне. Так, Манюшку, з лёгкай рукі яго першага біёграфа, знанага мінскага выдаўца Аляксандра Валіцкага, прыпісваецца музыка да чатырох твораў драматурга. Але на афішах таго ж "Рэкруцкага набору" пазначаны толькі адзін аўтар, разам з якім Манюшка пісаў музыку да знакамітай "Сялянкі", — Канстанцін Кшыжаноўскі. Менавіта так гучыць яго прозвішча, што паходзіць ад польскага "krzyz" — "крыж". Усе іншыя версіі (па нашых падручніках — Кржыжаноўскі, на афішы ў рускай версіі — Крижановский) ідуць ад няўмення правільна вымавіць польскае слова. І гэта яшчэ адна памылка, якую трэба выпраўляць! Што ж да Дуніна-Марцінкевіча, дык лісты Манюшкі стракацяць кпінамі на яго адрас, кампазітар узгадвае пра яго анекдоты, зусім не бяскрыўдныя. Усё гэта сведчыць пра тое, што адносіны ў іх складаліся не так бязхмарна, як нам хацелася б уяўляць.

Асабіста ў мяне наконт падвойнага аўтарства ў той жа "Сялянцы" ёсць наступная гіпотэза. Манюшка папросту кінуў працу над гэтым творам, і астатнюю музыку быў вымушаны дапісаць Кшыжаноўскі. Да ўсяго, эстэтычныя пазіцыі кампазітара і пісьменніка былі рознымі. Дунін-Марцінкевіч паўсюль падкрэсліваў еднасць з народам, ён арыентаваўся на сялянскую мадэль культуры, звязаную з фальклорам. Манюшка ж — на гарадскую, шляхецкую. І ў гэтым сэнсе кампазітар — яркі прадстаўнік не столькі беларускай ці польскай, колькі ліцвінскай музычнай культуры, якая вяла адлік ад часоў Вялікага Княства Літоўскага і, бы тая Атлантыда, знікла ў XX стагоддзі. Заўважу, што ліцвінская — зусім не сінонім літоўскай. Ні ў якім разе! Слова "беларускі" ў той час не выкарыстоўвалася шляхтай яшчэ і таму, што яно асацыявалася з тэрміналогіяй Расійскай імперыі. А "ліцвін" — азначала далучанасць да народа і культуры былога Вялікага Княства Літоўскага.

— Гэтая тэма па аб'ёме і грунтоўнасці, наколькі я разумею, можа выліцца ў вашу доктарскую дысертацыю. Пакуль жа вы закраналі яе хіба на навуковых канферэнцыях, у адным са зборнікаў навуковых артыкулаў, дзе вылучалі адметныя рысы гэтай культуры, што дазваляюць разглядаць яе як самастойную адзінку.

— Так, а ў дачыненні да Манюшкі адзначу, што менавіта з гэтай прычыны далучанасці яго да ліцвінскай культуры ягоны віленска-мінскі перыяд не знайшоў дасюль годнага навуковага асвятлення ні ў Польшчы (з-за геаграфічнай аддаленасці), ні ў Літве (бо не ўпісваецца ў літоўскую ментальнасць), ні ў Беларусі (бо гэтыя творы не столькі "беларускія", як мы гэта разумелі да нядаўняга часу, колькі еўрапейскія). Але ж колькі ў іх менавіта беларускіх рэалій, адлюстравання тагачаснага гарадскога ды мяшчанскага жыцця! І толькі зараз, калі мы пачалі разглядаць нашу нацыянальную культуру не толькі як сялянскую мадэль, а ўспрымаем яе ва ўсёй сукупнасці гістарычных складнікаў, з улікам не адно фальклорных, але і глыбінных прафесійных традыцый, такі падыход стаў магчымым.

Гутарыла Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА
У афармленні выкарыстаны адзін з малавядомых партрэтаў Станіслава Манюшкі.

Мастацкія і фінансавыя вынікі XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", які стаў, паводле традыцыі, адным з галоўных "цэнтраў прыцягнення" культурнага лета, даўно падведзены. А што выклікала найбольшую дыскусію ў сацыяльных сетках? Здавалася б, звыклы побытавы момант: асобных грымёрак для кожнага са шматлікіх удзельнікаў працяглых па часе гала-канцэртаў, як заўсёды, не хапіла. І перавага была аддадзена гасцям. Так сама, як заўсёды. Падобнае стаўленне "да сваіх" выклікала абурэнне заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Іны Афанасьевай, знятае на відэа журналістамі і выкладзенае ў Сеціве. Але абмеркаванне гэтай сітуацыі на старонцы ў "Фэйсбуку" культурнага аглядальніка Асі Паплаўскай, фрагменты з якога мы друкуем, вылілася ў куды больш шырокае кола праблем, што датычацца нашай нацыянальнай свядомасці.
Лексіку, прынятую пры вэб-стасунках, і асаблівасці напісання каментарыяў мы па магчымасці захоўвалі.

Грымёркі "без грыму"

Звыклыя праблемы ў закуліссі фестывалю

Ася ПАПЛАЎСКАЯ: — У нас асобныя грымёркі для замежных артыстаў, а беларускія няхай пераапранаюцца дзе і як хочуць! "Чаму вы выціраеце ногі аб беларускіх артыстаў?" — спыталася Іна Афанасьева. І правільна зрабіла: задзяўбло такое стаўленне беларусаў да сваіх!.. А павінна ж быць наадварот: спачатку — НАШЫ, пасля — усе астатнія! Толькі так у нас будзе культура. У самым шырокім сэнсе гэтага слова. Навучыцеся любіць і паважаць СВАЁ!

Таня ПАЛЯКОВА: — Узгадалася прыкрая гісторыя на "Міс Інтэркантыненталь", калі іншаземных журналістаў пасадзілі ў адным месцы, а сваіх, убогіх, сагналі ў асобную "рэзервацыю" на другім канцы залы. І калі выступалі запрошаныя "звяздулі", той жа Дзіма Білан з сябе вылазіў, бегаючы туды-сюды перад іншаземцамі, у бок беларусаў нават не паглядзеў…

Така ЦІХАНАВА: — Ася, на вялікі жаль, нашы "ЗОРКІ" часцяком адчуваюць і паводзяць сябе куды больш ЗОРНА, чым замежныя. Тут, хутчэй, смешна, чым крыўдна…

Ася ПАПЛАЎСКАЯ: — Таццяна, я разумею ваш скепсіс. Усе мы любім пасцябацца з нашай эстрады. Прычыны — зразумелыя. Але тут гаворка — пра звычайную павагу да чалавека, да СВАЙГО чалавека. І калі на тое пайшло, паглядзіце, каго пакінулі без грымёркі: Іну Афанасьеву! Такіх выканаўцаў на беларускай эстраднай сцэне — адзінкі. І смяяцца з гэтай прыкрай сітуацыі не трэба: абышліся з НАШЫМІ непрыгожа.

Віта САКАЛОВА: — Але ж беларускія артысты не байкатуюць "Славянскі базар"! А маглі б! Прапіярыліся б заадно!..

Ася ПАПЛАЎСКАЯ: — Вы думаеце такім чынам прымусіць адміністрацыю і дырэкцыю фестывалю іначай ставіцца да сваіх артыстаў?.. Сумняваюся.

Аляксандра БАЯРЫНА: — Віта, ёсць рэпутацыя і адказнасць перад сваімі гледачамі. Сабрацца і з'ехаць — праява непавагі да публікі. Дзеля таго, каб не дапусціць хаця б нязначнага негатыву са свайго боку ў адносінах да публікі, можна трываць і не такія знакі непавагі да сабе асабіста. Пагаджацца працаваць у такіх умовах — значыць, паставіць сябе вышэй. Гэта крок, калі асабістая адказнасць вышэй за адказнасць іншых.

Ася ПАПЛАЎСКАЯ: — Аляксандра, згодная цалкам. Узяць і зваліць — гэта сказаць свайму слухачу, які набываў білеты, прыязджаў спецыяльна ў Віцебск на фестываль: "Мне на вас начхаць! Я спяваю не для вас, а для сябе". Гэта няправільна. Таму і застаецца адно выказваць сваё незадавальненне за кулісамі. Тое, што адміністрацыя паступіла такім чынам, аддаючы перавагу не сваім, а замежнікам, — нонсэнс. Калі мы пазіцыянуем "Славянку" як фестываль фестываляў і кажам пра значнасць і маштаб, зрабіце так, каб УСІМ было камфортна, каб заслужаная артыстка не бегала ў пошуках памяшкання, дзе можна пераапрануцца! Гэта ж МІЖНАРОДНЫ фестываль, якому 22 гады!

Така ЦІХАНАВА: — Дурная справа — вінаваціць дырэкцыю фестывалю. Каб зразумець усю "штогадовую кашу", трэба ў ёй самой хаця б крыху паварыцца. Без крыўд, Ася, але за гэтых людзей я буду стаяць гарой.

Алег ЦІХАНАЎ: — Навошта штогод рабіць адно і тое ж? Размова ідзе пра канцэрт, у якім удзельнічае больш за 50 артыстаў + танцоры, менеджмент і г.д. Грымёрак у Амфітэатры на ўсіх не хопіць. Праблема — вечная. І Іна пра гэта ведае. Навошта гэтыя прыдзіркі? Беларускія артысты — яшчэ і прымаючы бок, гэта паказчык той жа гасціннасці. Вядома, калі выканаць усе райдары ад "А" да "Я", дык, відаць, фестываль давядзецца праводзіць раз на чатыры гады. Не падабаецца? Дык навошта прыязджаць?

Ася ПАПЛАЎСКАЯ: — Алег, калі не хапае грымёрак, няхай пабудуюць дадатковыя! Я не разумею, у чым тут пытанне.

Юрась ЗЯНКОВІЧ: — Калі не хапае грымёрак, дык стаўленне павінна быць АДНО ДЛЯ ЎСІХ, а не так, што мы перад замежнікам расшаркваемся, свой жа і такператопчацца. Калі да ўсіх будзе аднолькавае стаўленне, людзі (нармальныя!!!) гэта зразумеюць і "войдут в положение", і такіх сцэн не будзе. Афанасьева абураецца элементарнай несправядлівасці, і тут яна мае рацыю.

Алег ЦІХАНАЎ: — Памятаю, мы з гуртом "Osimira" былі ў грымёрцы з яшчэ трыма артыстамі з Аўстраліі і аргенцінцам, той яшчэ і фарбай стаў мазацца. Нам было весела! Грымёркі там маленькія, вядома, але гэта фестываль. А то як атрымліваецца: спярша атакуюць дырэкцыю фестывалю: "Вазьміце, у нас жа новы хіт!". А потым: "Дзе мая грымёрка?!"

Алег ЧЭЧАНЕЎ: — Усё спазнаецца ў параўнанні. Каб вы бачылі, у якіх умовах пераапранаюцца і грыміруюцца артысты сталічнага ТЮГа (сцэна Дома літаратараў)… Але ТЮГ знаходзіцца на рэканструкцыі, таму той экстрым — вымушаны.

Наталля БОНДАР: — У мяне калектыў — дзіцячы ўзорны, і калі мы прыязджалі раней на тэлефестываль "Усе мы родам з дзяцінства" ў Палац Рэспублікі, гэта быў проста нейкі жах! Ездзілі туды некалькі разоў, і штораз — адно і тое ж. Гадзіны з дзве сотням дзяцей даводзілася з касцюмамі ды рэквізітам стаяць у вестыбюлях, прычым там нават сесці не было куды. Калі дзеці садзіліся на батарэю, адразу з'яўляўся нейкі вартавы. Нарэшце, адчынілі грымёркі доўгачаканыя — у кожную, разлічаную на аднаго ці двух артыстаў, заганялі мой калектыў (восем чалавек) і яшчэ калектывы тры такія ж ды парачку салістаў. Да гэтага дадайце кіраўнікоў, мам ды тат і г. д. Прысесці можна было толькі ў зале… Я ўжо не кажу пра тое, што на сцэну пад час выступлення арганізатары не паспелі вынесці мікрафоны…

Ася ПАПЛАЎСКАЯ: — Наталля, дзеткі, якія былі ў такіх умовах, пасля стануць адміністратарамі на фестывалях і будуць думаць: нармальна, я ў свой час цярпеў, няхай цяпер яны церпяць! Дзе няма павагі да дзяцей, там не будзе яе і да дарослых…

Алег ЦІХАНАЎ: — Ася, ну што за крайнасці! Дзеці вырастуць і будуць ведаць, што гэта было цяжка, — ды зробяць інакш.

Алег ЧЭЧАНЕЎ: — Урэшце, а што перашкаджае адміністратару выканаўцы загадзя дамовіцца пра ўмовы знаходжання спявачкі?

Алег ЦІХАНАЎ: — А калі адміністратар і ёсць спявачка?

Жорстка, але не без падстаў

Лаліта УГАРАН-ТУМІЛОВІЧ: — Іна ўжо даўно заслужыла павагу і больш сур'ёзнае стаўленне. Гэта не яе капрыз і не піяр. Я сама не раз была сведкай таго, калі даецца загад размясціць прыезджых артыстаў з камфортам, зорак — адпаведна райдару. Не паверыце, а нашы нават у прыбіральнях рыхтаваліся. У свой час мы дастаткова папаездзілі з Інай Афанасьевай. Былі і прэстыжныя фестывалі, і туры па Беларусі. Ездзілі па такіх закінутых месцах, вёсках. Ні пра які камфорт мы і не задумваліся, не капрызілі. І ў машыне рыхтаваліся, і ў полі з мясцовымі жыхарамі алюмініевымі лыжкамі капусту сёрбалі. Іна заўсёды з цярплівасцю, разуменнем і гумарам да гэтага ставілася. Нашы артысты дзесяцігоддзямі бадзяюцца па трое-пяцёра ў грымёрках, а часам яшчэ і з танцорамі, грымёрамі! У духаце і за "трэба". Не спрабавалі задумацца, як рыхтуецца артыст да выступлення? Трэба апрануцца, знешнасць прывесці ў парадак, настроіцца, распецца… Важна, каб людзі "правільныя" атачалі ды многае іншае… Паверце, нашы артысты цярплівыя і даволі дыпламатычныя. Але калі ўжо просяць, дык накіпела. Нічога не змянілася! Як гадоў дзесяць таму Іна адзіная змагалася (а не піярылася) за годнае існаванне, так і цяпер! Заўсёды паважала Афанасьеву за смеласць і прафесіяналізм.

Алег ЧЭЧАНЕЎ: — Але ж вернемся да фестывалю міжнароднага ўзроўню. Мяркую, выканаўца падпісвае дамову з арганізатарамі, дзе са згоды бакоў мусіць быць прапісаны райдар — тэхнічны і побытавы. У тым ліку і пункт "Адмова ад выступлення пры невыкананні прымаючым бокам умоў дагавора". Эмоцыямі нічога не дакажаш. Спявачка выступіць перад гледачамі. Як яна павядзе сябе ў наступным годзе, пры наяўнасці запрашэння ў Віцебск, — гэта ўжо пытанне да яе.

Воля ЗІНОВАЯ: — Артысты беларускія, высылайце свае райдары! Не бойцеся, але і не адступайце, калі іх не выконваюць.

Яўген ЯРШАК: — Па-мойму, тут падмена паняццяў. Справа не ў тым, што Афанасьева ці Ярмоленка — беларусы... Але і так зразумела, што з замежнымі артыстамі такая сітуацыя немагчымая, бо яны, зноў жа, на думку арганізатараў, — "першы гатунак", інакш які сэнс іх запрашаць... Калі б хто-небудзь з запрошаных на "Славянскі базар" беларусаў быў дастаткова папулярным — і грымёркі былі б з кандыцыянерамі, і райдары б выконваліся.

Ягор ЗІНАВЫ: — Той артыст, які збірае мільёны і стадыёны, мае поўнае права выдумваць сабе райдары. А калі ў цябе адзін дыск і па радыё цябе слухаюць толькі таму, што абавязаны трымаць 75%?

Віта САКАЛОВА: — Так, папса — 75%. Але ж у Беларусі ёсць такія артысты, за якімі за мяжу фанаты едуць!

Алена КУРГАНАВА: — Ох, жорстка і незаслужана вы Іну брудам паліваеце. Любіць яе народ беларускай глыбінкі, і білеты на ейныя канцэрты разлятаюцца, як гарачыя піражкі! А што да грымёрак, дык падтрымліваю Алега: праблема ўсіх фестываляў!

Уладзімір ТРАПЯНОК: — Дык колькі можна прыкормліваць чужых "зорак", калі варта, перш за ўсё, падтрымліваць сваіх?..

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на www.facebook.com/kimpressby, www.vk.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

Тэатральная плошча

Хлестакоў — як праект Осіпа

Будучая прэм'ера Новага драматычнага тэатра — спектакль "Да нас прыехаў..." паводле п'есы М.Гогаля "Рэвізор" — нагадала мне своеасаблівы Клуб вясёлых і знаходлівых. Вясёлыя — трупа тэатра. Знаходлівыя — пастановачная група на чале з запрошаным рэжысёрам Аляксандрам Гарцуевым.

"Раман" Гарцуева з гэтым тэатрам пачаўся даўно. Менавіта тут гартавалася, калі можна так сказаць, яго рэжысёрская сталь. Асабіста для сябе з тых ягоных пастановак вылучаю дзве: "Шалёныя грошы" А.Астроўскага і "Тры Жыззэлі" А.Курэйчыка. На апошні спектакль была сабрана каманда з артыстаў трох тэатраў, таму ішоў ён рэдка, але карыстаўся попытам. У памяці засталася маўклівая выканаўца ролі старэйшай Жыззэлі Любоў Румянцава, ейны твар — прыцягальны, вытанчаны і незвычайна прыгожы, які свяціўся знутры, яе мудры погляд, скіраваны ў мінулае сваёй гераіні. Пэўна, на дадзены момант трупа Новага драматычнага знаходзіцца на піку формы і здольная ўвасобіць любую рэжысёрскую фантазію, бо іх зноў пацягнула адно да аднаго.

Рэжысёр абраў метад, ужо апрабаваны ім на "Раскіданым гняздзе" ў родным для яго цяпер Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Ён адным махам перанёс час дзеяння п'есы Гогаля ў нашы дні, пакінуўшы, праўда, некранутым месца — нейкая расійская глыбінка. Гараднічы — мэр, які прамантачыў дзяржаўныя грошы. Яго атачэнне — мафія, што кантралюе ўвесь горад. Дзяржыморда — маёр паліцыі, начальнік аддзела ўнутраных спраў, чалавек з адной звілінай у галаве, здольны хіба выконваць загады. Ці аддаваць іх. Жонка мэра Ганна Андрэеўна — вельмі "апетытная", сакавітая дама, якая раз-пораз змяняе ўбранні і не супраць пацешыць сябе маладым каханкам. Іх дачка Мар'я Антонаўна — гэткае, як стала модна казаць, "гламурнае кісо", рафінаваная, манерная істота, сэнс жыцця якой — шопінг, салон прыгажосці, начны клуб. Хлестакоў — нервовы, рэфлексуючы метрасексуал і заўзяты тусоўшчык.

Осіп — ці то байкер, ці то гопнік, "рэальны пацан" вулічнага выхавання з адпаведнымі звычкамі і паводзінамі. Аляксей Верашчака пераканаўча малюе яго гаспадаром, менеджарам Хлестакова, апошні ж — бы нейкі ягоны "праект", якім ён кіруе, арганізоўвае яму "туры" і пажынае фінансавы плён. У арыгінале на гэта няма і намёку. Дык хто такі Осіп, які звозіць Хлестакова на матацыкле "ад граху падалей", прадухіліўшы магчымы правал? Няяснай, размытай застаецца трактоўка Бобчынскага і Добчынскага. Але ўсе акцёры з відавочным задавальненнем "купаюцца" ў сваіх ролях, парадыруючы персанажаў, часам на мяжы з карыкатурай.

Мастак Яўген Волкаў абышоўся мінімальнымі выразнымі сродкамі, каб акрэсліць месца дзеяння той або іншай сцэны з дапамогай прадметаў і мэблі, якія акцёры самі выносяць на сцэну. Пачынаецца дзея на рыбалцы, дзе мэр адпачывае з падначаленымі. У надзіманы дзіцячы басейн наліваецца вада, засыпаюцца пластмасавыя рыбкі, якія потым угодліва чапляюцца на кручкі, імітуючы клёў. Карцінкі змяняюцца, бы кадры ў кліпе. Два металічныя "панцырныя" ложкі са старымі, нічым не накрытымі матрацамі і коўдрамі — завэдзганы гатэльны нумар, дзе спыніўся Хлестакоў. Невялічкі подыум з шастом, дзе выгінаецца танцоўшчыца-стрыптызёрша, — начны клуб, куды прыводзяць Хлестакова замест "богаўгодных устаноў". Два каўпакі для сушкі валасоў — салон прыгажосці, дзе бавяць час маці і дачка. Пунсовая канапа ў форме вуснаў (вытанчаная цытата дызайнерскай знаходкі Сальвадора Далі) — гасцёўня гараднічага.

Асучасніць Гогаля цалкам не атрымалася. Час напісання п'есы і сам яе аўтар бачныя ў слоўных абаротах ды, асабліва, фінальным маналогу Гараднічага, бліскуча сыграным Валерыем Агаянам. Гэта не рэжа слых, але непазбежна адсылае нас да сярэдзіны XIX стагоддзя. Таму спектакль катэгарычна супрацьпаказаны аматарам класічных інтэрпрэтацый твора. Ну а астатнім застаецца хіба дачакацца пачатку сезона! Шчыра ваш — Трапічкін. Прабачце, зайграўся, запрацаваўся —

Алег ЧЭЧАНЕЎ,
артыст і рэжысёр
Мінскага абласнога
драматычнага тэатра
Маладзечна

Дык **хто** там **прыехаў?**

Напрыканцы сезона Новы драматычны тэатр здаў мастацкаму савету гогалеўскага "Рэвізора" — спектакль Аляксандра Гарцуева пад назвай "Да нас прыехаў...". Сярод тых, хто ўбачыў генеральны прагон, аказаліся акцёр і рэжысёр Мінскага абласнога драмтэатра Алег Чэчанеў і рэдактар аддзела "К" Надзея Бунцэвіч. Таму рыхтавацца да прэм'еры, якой увосень адкрыецца новы сезон, вы можаце ўжо зараз, атрымаўшы адразу дзве рэцэнзіі.



Новым прачытаннем класікі, што пачынаецца з пераносу часу дзеі ў сучаснасць ці максімальна блізкі да яе перыяд, ужо нікога не здзівіць. Дык чым жа прыцягальная гэтая новая "рэвізія" — па-гарцуеўску? І з чым у ёй цяжка, можа, пагадзіцца? Што ж, паспрабуем "рэвізаваць" тое, што атрымалася. Хаця не выключана, што за час адпачынку пастаноўка яшчэ глыбей асэнсуецца трупай — і мы ўбачым "нанова новы" спектакль.

Рэвізуем класіку!

Каб хоць неяк унікнуць магчымых нападак за "псаванне" шэдэўра, рэжысёр азначае пастаноўку як камедыю "па матывах п'есы". Але змена назвы, на мой погляд, дыктуецца іншым. Словы "Да нас прыехаў..." адсылаюць не толькі да вядомага цыганскага раманса (яго фрагмент артысты спяваюць жыўцом), але і да мяжы 1980-х — 1990-х, калі перабудова пачала выводзіць на авансцэну жыцця (а разам з ім — і мастацтва, надзвычай чуйнага да змен "герояў нашага часу") новых уладароў. На старонках "Литературной газеты", што заставалася рупарам тагачаснай інтэлігенцыі ўсяго былога Саюза, узнік нават цыкл публікацый пад рубрыкай "Глядзіце, хто да нас прыйшоў!". І ў тым жа "Вішнёвым садзе" ўжо не Аня са студэнтам Пятром Трафімавым станавіліся "нашай светлай будучыняй", а прадпрымальны Лапахін, зганьбаваны ў савецкіх падручніках, — адзіны з герояў гэтай чэхаўскай п'есы, хто не дэмагогстваваў, а дзейнічаў.

Цяперашні спектакль — менавіта пра той час злому старой дзяржаўнай машыны і нараджэння новых кіроўцаў на бязмежных расійскіх прасторах з іх жудаснай прорвай паміж сталіцай і глыбінкай, калі на змену "партыйнай мафіі" прыходзіць крымінальная, куды больш жорсткая, якая не любіць "свяціцца" ды дзейнічае праз падстаўныя фігуры. Таму такімі неадназначнымі і пададзены персанажы гогалеўскага "Рэвізора", што кожны разглядаецца быццам з двух бакоў — ранейшага і цяперашняга часавых вымярэнняў. Раней — значыць, у 1980-я, самыя дэмакратычныя за ўвесь савецкі час (мэр горада, яго сям'я ў нармальных зносінах з гэткім пастарэлым прадстаўніком маладзёжнай субкультуры), у "ліхія дзевяностыя", шлейф праблем з якіх цягнецца і ў сённяшнія расійскія рэаліі. Адсюль і трансфармацыя характараў герояў. Увогуле, мала ў якіх пастаноўках "Рэвізора" (асабіста я такіх не бачыла) персанажы так дэталёва індывідуалізаваны, як у Аляксандра Гарцуева. Бо звычайна не толькі Добчынскі з Бобчынскім малююцца гэткімі "блізнюкамі" (бывае, ледзь не сіямскімі), але і астатняе атачэнне Гараднічага — літаральна на адзін твар, часам нават у аднолькавых сцэнічных строях.

А тут — якая разнастайнасць! Моцным бокам Гарцуева-рэжысёра заўсёды было ўменне надзвычай дакладна зразумець і выявіць праз акцёраў усё тонкасці ўнутраных памкненняў герояў, псіхалагічную матывацыю іхніх учынкаў. Многіх артыстаў — не пазнаць, для кожнага з іх гэты спектакль — крок наперад: дзе праз перайманне, а дзе і праз уласныя пошукі ды знаходкі. Таму персанажы новай пастаноўкі паўстаюць не адно абагульненымі сімваламі (а значыць — маскамі, уласцівымі фарсу), а яшчэ і жывымі людзьмі, са сваёй адметнай манерай гаварыць і рухацца (пластыка, як і музычнае афармленне, таксама належаць Аляксандру Гарцуеву). Гэта нараджае ў гледачоў адпаведную рэакцыю ў адказ — тое эмацыйнае багацце, дзе абавязкова знойдзецца месца і спачуванню, бо амаль кожны з герояў трапляе ў няпростае для сябе становішча. Але ж якімі пазнавальнымі атрымліваюцца "тыпажы"! Прычым падвойныя, бо ў кожным "чытаецца" сацыяльны тып — і псіхалагічны. Часта яны не супадаюць, што і надае старому сюжэту новыя акцэнты.

Скарачаючы літаратурны тэкст, рэжысёр робіць купюры ў абсалютна нечаканых момантах — напрыклад, у знакамітым маналогу Хлестакова (Павел Чарноў). У тым жа Бобчынскім (Аляксандр Гусеў), адмаўляючы скорагаворку і надзвычай уважліва інтэрпрэтуючы асобныя фразы, выводзіць на першы план ягонае жаданне "ўвайсці ў гісторыю": маўляў, раскажыце там, у Пецярбургу, што жыве такі Пётр Іванавіч (чым не тэма "маленькага чалавека", што праходзіць праз усю рускую класіку?). І, замест падзелу персанажаў на "галоўных" ды "другасных", раптам цэнтральнымі становяцца ўсе, толькі кожны — у свой момант. І гэтак жа ў кожнай ролі з'яўляюцца не толькі жартоўныя, але і папраўдзе трагічныя ноткі. А ў самім спектаклі мудрагеліста сплятаюцца жанравыя пазнакі побытавай камедыі, фэнтазі, трылера, байкі, дзе людзі заменены жывёламі, дэтэктыва з нечаканай развязкай (Осіп зусім не адразу выходзіць на першы план, увасабляючы ценявыя структуры), драмы, дзе на нашых вачах руйнуюцца былыя ідэалы асобных герояў…

Вядома, у спектаклі можна, пры жаданні, знайсці і "слабыя месцы", і некаторыя акцёрскія "недацягванні". Але тое, што пастаноўка была ажыццёўлена не проста ў тэрмін, а яшчэ і з апярэджаннем графіка, сведчыць пра даўно складзеную, добра прадуманую рэжысёрскую канцэпцыю — і шчырае жаданне трупы ўвасобіць яе як мага лепш. Спектакль, і гэта галоўнае, вымушае гледачоў не толькі смяяцца, не толькі здзіўляцца даўно вядомаму, але і над чымсьці задумвацца, штосьці пераасэнсоўваць — думаць, прычым у самым шырокім сэнсе гэтага слова. І ў самым доўгатэрміновым, калі мысліцельны працэс працягваецца і пасля спектакля, не маючы ніякіх часавых абмежаванняў. Сапраўды, ці ж можна адразу, з наскоку, спасцігнуць не знешне палітычныя, а куды больш глыбокія філасофска-псіхалагічныя перадумовы ды наступствы любога грамадскага пералому, усю размаітасць гістарычных паралелей і асацыяцый, што ўзнікаюць пры гэтым?..

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Майстар: на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва

Цвёрдасць скульптара

"Пішыце маё прозвішча без мяккага знака: "Міс-ко". Гэтую фразу я пачуў шмат гадоў таму, калі пазнаёміўся з Іванам Якімавічам у Мастацкім музеі, дзе на выстаўцы, сярод іншых работ, быў скульптурны партрэт Зіны Партновай.

— Уяўляеш: яна, сямнаццацігадовая дзяўчына, у час допыту ў гестапа схапіла пісталет следчага, што ляжаў на стале, застрэліла яго і яшчэ двух гітлераўцаў! — Іван распавядаў з захапленнем, а я глядзеў на аўтара і разумеў, што яго захопленасць шмат чаго вартая...

А тое, што прозвішча — без мяккага знака, характэрна для народнага мастака Беларусі Міско.

Ён цвёрды ў сваёй творчасці.

Пра Міско яшчэ мала напісана. Яго біяграфія поўная займальных гісторый. У 1968 годзе ў Чэхаславакіі (Міско прызвалі на зборы проста з майстэрні) ён зялёнкай (фарбаў пад рукамі не было) маляваў па памяці партрэты жанчын "ню", каб згладзіць нягоды ваеннага жыцця. 17 партрэтаў на ватмане хацеў набыць паляк з суседняй часткі. Мастак адмовіўся прадаваць, і яны з аднапалчанамі закапалі іх у зямлі ў гарматнай гільзе…

— Магчыма, калі-небудзь адкапаюць, — смяецца Міско.

У Ліване, дзе Міско ўдзельнічаў у міжнародным пленэры, адказваючы на пытанні журналісткі, адкуль ён і што азначае ягоная работа з мармуру два метры на паўтара, сказаў, што знаёмы з Клімуком, двойчы Героем Савецкага Саюза, таму тэма твора — космас, і Ліван бачны з космасу, хаця краіна — маленькая.

— Я стаў вельмі папулярным, да мяне прыходзілі фатаграфавацца, таму што жвавая журналістка з ліванскай газеты напісала, што я — рускі касманаўт, двойчы Герой Савецкага Саюза, і ў маім творы адлюстраваны Ліван, які я бачыў з космасу…

— Трэба вучыць хаця б англійскую мову, — рэзюмаваў скульптар.

Народны мастак Беларусі Іван Міско.

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі прайшла выстаўка "Космас Івана Міско". Цвёрдасць выбару Івана Міско заключаецца ў яго любові да жыцця, зямлі, космасу.

— Мару ўпрыгожыць вуліцу Касманаўтаў у Мінску барэльефам трох беларускіх касманаўтаў: Клімук, Кавалёнак і Навіцкі заслужылі гэта. Для тых, хто жыве ў Беларусі, гэта — гонар, — сказаў Міско на сустрэчы пад час закрыцця выстаўкі.

Паэт Фёдар Баравы прысвяціў Івану Міско паэму "Душа творцы". Там ёсць такія радкі: "И жизнь напрасно не уходит, пока болит душа творца!".

Юрый ІВАНОЎ
Фота аўтара

Дызайнерскі ход

Знакаміты беларускі дызайнер Уладзімір Цэслер стварыў арыгінальны плакат да Кіеўскага міжнароднага джазавага фестывалю: як заўжды, тонка, стыльна, з тым непаўторным цэслераўскім гумарам.
Выява прадастаўлена аўтарам

Фестываль

Сярод спектакляў беларускай праграмы на чарговым Міжнародным тэатральным фестывалі "Белая Вежа" будзе і пастаноўка гаспадароў форуму — Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы і камедыі. Ёй стане "Ураджай" паводле п'есы Паўла Пражко.

Фота прадастаўлена дырэкцыяй фестывалю

Мастыхін

У Бабруйскім мастацкім музеі імя Г.Г. Паплаўскага праходзіць выстаўка работ XI Міжнароднага пленэру па кераміцы "Арт-Жыжаль". Але ж ці могуць гэтыя застылыя-астылыя фантазіі перадаць тое полымя эмоцый, што палала ў лагеры ўдзельнікаў цягам амаль трох тыдняў і выбухнула феерверкам іскраў, калі абпальвалі "вогненную скульптуру" вышынёй з чалавека?

Жыжаль знутры засвяціўся

Вада, агонь і "трубы" для... керамікі

Валерый Калтыгін і госці пленэру ля вогненнай скульптуры.

Быццам і сапраўды матэрыялізаваўся, ажыў, выдыхнуў ззяннем сам Жыжаль — бог агню, здольны, паводле беларускай міфалогіі, перамагчы нават Перуна, які ўзначальваў пантэон славянскіх богаў і заўсёды ў той або іншай ступені сімвалізаваў ваяўнічасць. Сапраўды, пленэр з красамоўнай назвай "Арт-Жыжаль" нясе ўзаемаразуменне, што дасягаецца сілай мастацтва, а не зброі.

Сёлета на Бабруйшчыну з'ехаліся прадстаўнікі пяці краін: Латвіі, Малдовы, Расіі (у тым ліку з Рэспублікі Башкартастан), Украіны і, вядома ж, Беларусі. Іх пасялілі ў летніх домиках на базе адпачынку "Вербкі" на беразе Бярэзіны, дзе кожны з 22-х майстроў стварыў па дзве-чатыры работы, агульная колькасць якіх, такім чынам, склала больш за 60.

— Частка гэтых твораў, — распавядае кіраўнік пленэру, вядомы кераміст Валерый Калтыгін, — застаецца ў дар Музею імя Г.Паплаўскага, штосьці ўдзельнікі забіраюць з сабой. Вядома, хацелася б, каб пленэр меў свой уласны музей, дзе збіраліся б створаныя на ім работы. Такая практыка ўжо добра зарэкамендавала сябе ў свеце, гэта ўзнімае статус і самога пленэру, і ўсёй краіны. Але і зараз Бабруйск мае вялікую аддачу ад нашага форуму. Бо акрамя згаданай выстаўкі, што пазней пачне вандраваць па іншых гарадах, удзельнікі дэкаратыўна афармілі Дзіцячую бібліятэку № 16. І гэта таксама наша традыцыя, бо летась мы гэтак жа афармлялі Цэнтральную бібліятэку.

Кульмінацыя свята — "вогненная статуя", выраблена Валерыем Калтыгіным упершыню на гэтым пленэры, — таксама ўжо мае сваю "традыцыю", што сыходзіць каранямі ў... Купалле. Не, нашы продкі не абпальвалі на свята гліняныя вырабы — упершыню гэта зрабілі на сёлетнім фестывалі "Александрыя збірае сяброў" васьмёра беларускіх керамістаў, якія, да ўсяго, праводзілі там свае майстар-класы. А павучыцца ў нашых мастакоў ёсць чаму не толькі аматарам, але і замежным прафесіяналам. Пра гэта ледзь не ў адзін голас сцвярджалі ўдзельнікі пленэру, адзначаючы высокі ўзровень апошняга. І гэта не проста кампліменты, бо многія з гасцей аб'ездзілі ўсю Еўропу, ім было з чым параўноўваць. Нашы керамісты самі робяць абпалы, валодаюць старадаўнімі ды найсучаснымі тэхналогіямі, не баяцца эксперыментаваць і рызыкаваць. Дарэчы, галоўная рызыка — сам абпал керамікі, асабліва такі, як абвар, калі выраб адразу пасля распальвання перамяшчаецца ў клейстар з жытняй ці аўсянай мукі. Вядома, выраб можа патрэскацца, а то і ўвогуле раскалоцца на часткі. Але тое, што атрымліваецца пры ўдалым выніку, вартае ўсіх затрат ды хваляванняў! Удзельнікі пленэру даказалі гэта не толькі гатовымі творамі, але і самім працэсам нараджэння ды вогненнага "гартавання" скульптуры Жыжаля. Калісьці ў знакамітага графіка Валерыя Славука гэтая міфічная істота падавалася нібы сатканай з залатых нітак. У Валерыя Калтыгіна — нагадала ідала часоў паганства і адначасова — ажурныя выцінанкі, карункі з арнаментам. А сам працэс яе абпальвання (для большых уражанняў — начнога) стаўся сапраўдным відовішчам, годным найсучаснага вулічнага тэатра лялек: ледзь толькі разматалі абкручаную вакол скульптуры "трубу" з вогнетрывалай мінеральнай ваты і алюміневай фольгі, Жыжаль засвяціўся знутры...

14 кастрычніка выстаўка "пераедзе" ў сталічны Палац мастацтва, потым — у Магілёў. А праз год керамісты збяруцца ў дванаццаты раз…

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Аляксандра ЧУГУЕВА

Акцыя “К”: журналісцкі аўтапрабег па СДК і не толькі

Разбурыць маёнтак... Каму гэта выгадна?

На спідометры — 353 кіламетры нашай экспедыцыі, на гадзінніку — 15.20. Самы час працягваць паглыбленае знаёмства з сельскімі брэндамі. Яшчэ ў Мінску, плануючы маршрут і выбіраючы аб’ект нашай увагі ў Чашніцкім раёне, спыніліся на Іванску: як-ніяк, гэтае месца звязана з даволі вядомым на Беларусі родам Валадковічаў. Менавіта ў ваколіцах Іванска ў гэтых беларускіх шляхцічаў размяшчаўся велічны палац, а ў ім — галерэя ды бібліятэка, якой маглі карыстацца і мясцовыя жыхары. Сёння замест палаца — рэшткі адной са сцен... Тым не менш, досыць добра захаваліся службовыя сядзібныя збудаванні, паўнавартаснымі гаспадарамі якіх сябе лічаць буслы. А што ж людзі?

Культурная інфраструктура і яе адсутнасць

Як адзначылі ў сельсавеце, колькі гадоў таму адзін інвестар выкупіў захаваныя збудаванні шляхецкага маёнтка, пачаў ужо рабіць рэстаўрацыю, але раптоўна памёр… Таму цяпер мясцовыя ўлады, чакаючы новага гаспадара, па меры магчымасці даглядаюць аб’ект, які, на вялікі жаль, не ўваходзіць у Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей нашай краіны. І гэта прытым, што ў Чашніцкім раёне, за выключэннем Троіцкай (Белай) царквы ў аднайменнай вёсцы, астатнія помнікі — брацкая магіла, гарадзішчы, курганныя могільнікі. Як жа тады прывабіць турыста, не выкарыстоўваючы існуючыя (пакуль!) помнікі архітэктуры?

Магчыма, фальклорам. Як аказалася, Іванск мае яшчэ адну адметнасць. Гэтым разам на карце ўстаноў культуры краіны мы ўпершыню за час нашай вандроўкі сустрэлі не проста Дом культуры або сельскі клуб, а Дом фальклору.

Надзея на цікавае знаёмства з установай новага тыпу трохі азмрочылася неспадзеўкай: нягледзячы на расклад працы, дзверы ў Дом фальклору былі зачынены. Тым не менш, вырашылі не спяшацца з высновамі, разнастаіўшы чаканне дэгустацыяй марожанага ў мясцовай краме. Як аказалася — зусім не дарэмна: прайшло літаральна дзесяць хвілін, а ў Доме фальклору ўжо не тое што дзверы былі адчынены — поўнай хадой ішла рэпетыцыя. Адсутнасць жа на працы тлумачылася выступленнем на свяце вуліцы.

У адсутнасць дырэктара ўстановы (яна паехала па аргпытаннях у райцэнтр) пазнаёміліся з актывам, а таксама з мясцовым кіраўніком, старшынёй Іванскага сельвыканкама Людмілай Марозавай, якая кінула ўсе клопаты і цягам некалькіх гадзін суправаджала нас. (Было бачна, што не толькі з-за хвалявання ад нечаканага візіту сталічных журналістаў, а з-за шчырай цікавасці, неабыякавасці да роднай культуры.) Па яе словах, установа ў мінулым годзе зарабіла больш за тры мільёны рублёў, у тым ліку за кошт шматлікіх канцэртаў у вёсках ды аграсядзібах.

Адметнасць Дома фальклору — не толькі ў перыядычным выкананні народных песень, але і ў іх назапашванні. Акампаніятар установы Аляксандр Мінчукоў адзначыў: фальклор збіраецца пад час штогадовых экспедыцый па вёсках сельсавета. Акрамя таго, супрацоўнікі Дома фальклору вывучаюць і ставяць мясцовыя абрады. Тыя ж Юр’е, “Жаніцьба Цярэшкі”, зажынкі і нават Каляды маюць сваю спецыфіку.

Важны аспект: мясцовая моладзь, дзеці з задавальненнем прыходзяць займацца цікавай справай у гурткі ўстановы. А чаму б і не пайсці, калі ва ўстанове працуе Віталія Бурэц? Сімпатычная дзяўчына вядзе тры гурткі: фальклорны, драматычны, саломкапляцення. Цікава, што па адукацыі яна — аграном, але са школы цікавіцца культурай, фальклорам. Не выпадкова сёлета Віталія плануе паступаць на завочнае аддзяленне БДУКіМ і авалодаць рэжысурай народных святаў. Але, акрамя намаганняў Віталіі Бурэц, на майстар-класы для дзетак старэйшага ўзросту рэгулярна запрашаюцца народныя майстры, рамеснікі. Усяго за некалькі гадзін можна ўбачыць, як ствараецца сапраўднае мастацтва рукамі разьбяроў па дрэве, ці пазнаёміцца, а то і авалодаць азамі бондарства. Думаецца, калі б супрацоўнікі Дома фальклору здымалі на відэа ўвесь працэс майстар-класаў, то іх фільмы абавязкова былі б запатрабаваны.

1.

Відавочна, што Дом фальклору — гэта не толькі шыльда з назвай установы новага тыпу, але і цікавыя праекты, вялікі аб’ём працы па спазнанні і папулярызацыі народнай культуры.

Якім жа было наша здзіўленне, калі даведаліся, што зусім побач з Іванскім домам фальклору дзейнічае яшчэ адзін — у **вёсцы Сялец** (паказанні бартавых прыбораў: 360 км, 16.00), да слова, на тэрыторыі таго ж сельсавета. Яго адметнасць (вядома ж, не галоўная) — у невялікай музейнай экспазіцыі. Асноўная ж функцыя ўстановы, з якой яна спраўляецца, — захаванне народных спеўных і этнаграфічных традыцый, а таксама правядзенне святочных мерапрыемстваў. Вёска — маленькая, а таму кіраўніку Дома фальклору часам даводзіцца абыходзіць ці не ўсе двары — асабіста запрашаючы мясцовых жыхароў на тое або іншае свята. А для патэнцыйных турыстаў, дачнікаў дый проста цікаўных жыхароў іншых вёсак перад правядзеннем таго або іншага мерапрыемства абавязкова праводзіцца рэкламная кампанія… у выглядзе абвестак у мясцовай краме. Чым не прыклад плённага супрацоўніцтва ды ўзаемападтрымкі сельскіх устаноў?

Я быў у Сяльцы гадоў пяць таму. Баюся памыліцца, але менавіта тут, не без падачы тагачаснага начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Мікалая Пашынскага, было

На людным месцы

Бібліятэка на тураб’екце мае сэнс

У Гродзенскім раёне маецца ўнікальны помнік гідратэхнічнага будаўніцтва XIX стагоддзя — знакаміты Аўгустоўскі канал. Адна з найстарэйшых бібліятэк раёна — Сапоцкінская гарпасялковая — пашырае сярод падлеткаў веды пра гэты аб’ект.

САПОЦКІН

У чытальнай зале афармлена разгорнутая краязнаўчая кніжная выстаўка “Край мой Прынёманскі! Край дарагі!” з цэнтральным раздзелам “Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў”. У бібліятэцы налічваецца 72 асобнікі выданняў з цікавай і пазнаваўчай інфармацыяй пра мясціны. Вядзецца і тэматычная картатэка, куды ўвайшло больш за 300 артыкулаў з перыёдыкі. У чытальнай зале ладзяцца Дні польскай і літоўскай літаратуры, на якіх афармляюцца прагляды выданняў.

Бібліятэкары распрацоўваюць для дзяцей і падлеткаў тэматычныя віктарыны, конкурсы, гутаркі. Навучэнцам дапамагаюць у праектнай дзейнасці, таму юныя чытачы з ахвотай карыстаюцца інфармацыяй для напісання школьных заданняў з тэматычных папак: “Аўгустоўскі канал: панарама падзей”, “Зямля Сапоцкінская”, “Аўгустоўскі канал у гады вайны”.

Установа з дапамогай аддзела маркетынгу РЦБ рыхтуе і выдае краязнаўчыя буклеты. Маюць поспех у нашых гасцей і календары з відамі слыннага аб’екта, падрыхтаваныя ды выдадзеныя раённай бібліятэкай.

Традыцыйным у дзейнасці Сапоцкінскай ГПБ стала праца супрацоўніка на Аўгустоўскім канале. Улетку на пляцоўках апошняга афармляецца кніжная выстаўка. Госці цікавяцца інфармацыяй, набываюць нашы выданні. Такім чынам бібліятэка выконвае план платных паслуг.

Таксама ў бібліятэцы арганізаваны мультымедыйны цэнтр, дзе юныя чытачы могуць паглядзець фільм пра канал, азнаёміцца з інфармацыяй на электронных носбітах. Варта распавесці і пра тэматычныя чытанні, якія праходзяць штомесячна для вучняў аднаго з класаў Сапоцкінскай СШ і суправаджаюцца медыяпрэзентацыямі. Атрымліваюцца цікавыя падарожжы па гісторыі, экалогіі, сучаснасці аб’екта.

Пад час кніжнай выстаўкі ў зале бібліятэкі.

Пры ГПБ летась быў арганізаваны дзіцячы клуб “Пачытаем — пагуляем”. У праграмы яго пасяджэнняў уключаюцца мерапрыемствы, прысвечаныя Аўгустоўскаму каналу. Юным чытачам вельмі падабаюцца пасяджэнні, у праграмы якіх уключаны “Кулінарныя гульні”, дзе бібліятэкары навучаюць гатаваць мясцовыя прысмакі, распавядаюць пра гісторыю кухні рэгіёна.

Дарэчы, пра сваю працу бібліятэкары апавялі на раённым семінары “Выкарыстанне патэнцыялу Аўгустоўскага канала для экалагічнага выхавання і адукацыі моладзі”. Установа прымае ўдзел у Міжнародным свяце “Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў”. А два разы на год на канале праводзіцца свята “Аўгустоўскі канал запрашае сяброў”.

Святлана РОБАК,
галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Гродзенскай раённай цэнтральнай бібліятэкі

Лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

праведзена адно з першых святаў беларускай вёскі. Як важна быць першым у творчай справе! Як важна адчуваць сябе першаадкрывальнікам і ведаць, што ўсе наступныя — толькі паслядоўнікі... Мне расказвалі, што свята вёскі ў Сяльцы было не толькі вясёлым ды яркім, але і карысным для сельсавета: конкурс вады за год да мерапрыемства прымусіў пачысціць ды аздобіць усе вясковыя калодзежы. І гэта быў сапраўдны крэатыў!..

Заўжды новы музей

На спідометры — 370 кіламетраў. І мы зноў — у раённым цэнтры. **Чашнікі** ўражваюць новымі, нядаўна здадзенымі жылымі будынкамі. І зноў — новае знаёмства. Аддзелам ідэалогіі, культуры і па справах моладзі кіруе Тацяна Пчолкіна — жвавая, актыўная ды няўрымслівая. А намеснікам у яе — даўняя знаёмая "К" Вольга Яскевіч, дасведчаная ва ўсіх "драбніцах" раённых культурных спраў. Разам з імі мы наведвалі мясцовы краязнаўчы музей, які, да слова, чакае рамонту.

Не спыняючыся на экспазіцыі, хочацца адзначыць відавочныя перавагі музея. Гэта і само памяшканне (прыгожы будынак XIX стагоддзя ў цэнтры горада), і інтэрактыўныя магчымасці (да некаторых прадметаў можна не толькі дакрануцца, але і, скажам, узяць у рукі — як той жа цэп для збожжа). Нельга не адзначыць і пастаяннае абнаўленне экспазіцыі. Напрыклад, зусім нядаўна ў музеі з'явілася аўтэнтычная крама XIX стагоддзя. Як вынік — нават мясцовыя жыхары з задавальненнем наведваюць установу. Дарэчы, рэкламную абвестку музея, якая, праўда, на рускай мове (відаць, з арыентацыяй на расійскіх гасцей Чашнікаў?), мы ўбачылі ці не самым багатым на турыстаў месцы — у мясцовым гатэлі.

"Традыцыйная" праблема з сувенірамі. Улічваючы маштабы Раённага дома рамёстваў, прадстаўлены асартымент выглядае надта ўжо сціплым. А дзе ж купіць вырабы майстроў, як не ў музеі? Праўда, у Чашніках можа неўзабаве з'явіцца адмысловая сувенірная крама: такая ідэя маецца ў начальніка аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Тацяны Пчолкінай. *(Дыскусія адносна падтрымкі народных майстроў ды мэтазгоднасці стварэння сувенірных крам у раённым цэнтры — у адным з наступных нумароў "К".)*

Пакідаючы ранкам Чашніцкі раён, які ў чарговы раз па-добраму здзівіў — найперш, адказным стаўленнем да спадчыны, традыцыйнай культуры, — накіроўваемся далей на ўсход, у Сенненскі раён.

2.

3.

4.

5.

6.

На здымках:
1. У гэтым будынку, што ў вёсцы Пламя, працаваў Янка Купала.
2. Далёка не ў кожным сельскім паселішчы сустрэнеш такі амфітэатр, як у Вішове.
3. Віталія Бурэц з Іванска — не спецыяліст у сферы культуры, але збіраецца сёлета паступаць у БДУКіМ.
4. Дырэктар клуба ў Ракушаве Надзея Лепешава.
5. Стылізаваная музейная крама купца Гурэвіча.
6. Апошні фрагмент палаца Валадковічаў аблюбавалі буслы.

На варце — баршчавік

У **вёсцы Пламя Сенненскага раёна** "К" — не ўпершыню. Наша газета шмат пісала пра палац, у якім у 1903 — 1904 гг. працаваў народны паэт Янка Купала, пра грамадскія і прамысловыя пабудовы. Цікавым аказаўся і чарговы прыезд у колішнюю **вёску Старая Беліца** ў апошні дзень аўтавандроўкі (399 км). Нягледзячы на тое, што на гадзінніку было 12.00, мясцовы Дом культуры быў на замку: згодна з графікам, у пятніцу ён пачынае сваю працу на гадзіну пазней. Не марнуючы часу, вырашылі наведаць колішнія велічныя муры. Будынак вінакурні, узведзены ў XIX стагоддзі, па сваіх маштабах і тэхнічным аснашчэнні не меў аналагаў на тэрыторыі колішняга Паўночна-Заходняга краю. Ён і зараз прымушае задумацца над тэхналогіямі нашых продкаў. Вось толькі сучаснікі, якія валодаюць унікальнымі камп'ютарнымі тэхналогіямі, пакуль не вынайшлі, як змагацца з галаўным болем нашага часу — баршчавіком, які ўздоўж вінакурні вымахаў у рост чалавека, калі не вышэй.

Праўда, старшыня Беліцкага сельсавета Сяргей Галынчык, якога мы напаткалі побач з вінакурняй, запэўнівае, што баршчавік ля старадаўняй спіртоўні яе ўласнік-прыватнік знішчыць калі не сёння, дык дакладна — заўтра. З іншага боку, нам прыйшла і такая думка: можа, вакол старадаўніх занядбаных сядзіб, а то і на іх тэрыторыі, не трэба знішчаць атрутную расліну? Хай гэта будзе прыродным сродкам абароны ад вандалаў ды аматараў нажывы!..

Кажа Сяргей Галынчык і пра тое, што прэтэнзій да работы ўстаноў культуры ў яго няма: працуюць добра. А вось мясцовыя жыхары з ім не зусім згодны. Скаргі абуранага насельніцтва, якія мы пачулі ў мясцовай краме, зводзяцца да аднаго: мясцовы клуб працуе неэфектыўна. У першую чаргу, з-за новага памяшкання (стары СДК — будынак XIX стагоддзя — зараз у паўразбураным стане), зусім не прыдатнага для правядзення мерапрыемстваў, тых жа дыскатэк. На жаль, правесці словы мясцовых жыхароў не атрымалася: і а 13-й Дом культуры не адчыніў свае дзверы. Па ўсёй верагоднасці, яго супрацоўнікі на той час былі ў адпачынку.

Як стварыць аграсядзібу?

Трэці дзень. У старадаўні Друцк Талачынскага раёна вырашылі не завітваць. Тым не менш, не маглі не спыніцца на шляху ў Магілёўшчыну каля воднага млына, які самотна стаіць занядбаны побач з трасай. Хто ведае, можа, праз колькі гадоў пад час нашага чарговага падарожжа ён займее руплівага гаспадара і стане цікавым культурна-забаўляльным аб'ектам Талачынскага краю…

498 кіламетраў шляху, 14-я гадзіна, і вось нарэшце — **Магілёўшчына. Круглянскі раён** запамінаецца вёскай **Ракушава** (14.00). Менавіта тут дзейнічае клуб культурна-сацыяльных паслуг. А кіруе ім Надзея Лепешава. Вельмі цікава, што адначасова з'яўляецца яна і гаспадаром аграсядзібы (што адметна, з вялікай радасцю прымае жанчын з дзецьмі, інвалідаў). Размаўляючы пра асаблівасці клуба, мерапрыемствы, надзённыя клопаты жанчына прызналася, што літаральна ў жніўні збіраецца звальняцца. Сітуацыя, з якой сутыкнулася Надзея Лепешава, наступная: праца ёсць — умоў няма. Да стану будынка клуба прэтэнзій няма, чаго не скажаш пра вясковую інфраструктуру. Дабірацца ўначы (пасля правядзення пятнічных і суботніх дыскатэк) дадому па вуліцах без асвятлення — справа не з простых. У выніку клуб можа застацца без кіраўніка, а разам з гэтым — і адзінага супрацоўніка, мясцовыя ж жыхары — без мерапрыемстваў…

Лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

У час аўтападарожжаў на нашым шляху трапляліся разнастайныя вёскі, мястэчкі і гарады — з адпаведнай інфраструктурай ці яе адсутнасцю. Здавалася б, згодна са статусам, райцэнтр павінен мець нават не адну ці дзве кавярні, шмат разнастайных крам, зрэшты, добрыя месцы адпачынку. Помніцца, у Васілішках — вёсцы ў Шчучынскім раёне — у краме можна было паласавацца і свежай выпечкай ды кавай. Праязджаючы Круглае (няхай сабе райцэнтр мае статус гарадскога пасёлка) спадзяваліся таксама на гасціннасць. На жаль, кавярню, што працуе, нягледзячы на намаганні, так і не знайшлі. А калі няма такой элементарнай інфраструктуры, пра якую ж прывабнасць у турыстаў можна казаць? Можа, калі няма кавярняў у крамах, выкарыстоўваць для гэтых мэт музеі? Чым не тэма для дыскусіі?..

(Заканчэнне на стар. 12.)

На людным месцы

Майстар-клас на "...Запустах"

У чарговы раз у Бельску, што ў Падляшскім ваяводстве Польшчы, прайшлі "Спасаўскія запусты", арганізаваныя мясцовым аддзелам Беларускага грамадскага культурнага таварыства і Бельскім домам культуры. Удзел у свяце ўзяў фальклорны гурт з вёскі Балота Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

"Спасаўскія запусты" — традыцыйны фестываль, прысвечаны летняй абраднасці. Таму і пачалося свята інсцэніроўкай жніўнага абраду, у якім удзельнічаў польскі калектыў "Падляшанкі" з Гродзіска (гміна Нараў) і дзіцячы тэатральны калектыў "Антракт" з Бельскага дома культуры. Жанчыны звязвалі ахапак недакошанага ў час жніва збожжа, якое потым упрыгожвалі кветкамі, а на зямлі, паміж каласкамі, клалі кавалачак хлеба для жывёлы. Абраду спадарожнічалі народныя песні: жніўныя, любоўныя, аб роднай зямлі...

Танцавальны майстар-клас ад бабуль Кобрынскага раёна.

А пасля ў мясцовым амфітэатры праходзіў вялікі канцэрт беларускіх калектываў Падляшша, такіх як "Васілёчкі", "Куранты" і "Маланка" з Бельска, "Зараніца" з Крынак, "Шалуха" з Аўгустова, "Дэкада Бэнд" з Беластока ды іншых.

Выступалі, зразумела, і прадстаўнікі Беларусі, якія сталіся, без перабольшання, сапраўднай фішкай "Спасаўскіх запустаў". Бабулі з Кобрынскага раёна выкананалі перад тысячамі гледачоў, што сабраліся каля летняга амфітэатра ў Бельску, шмат традыцыйных песень з Беларускага Палесся, а пасля нават паказалі майстар-клас з традыцыйных палескіх танцаў — кракавяка і падэспаня. Радасці гледачоў не было межаў: праз некалькі хвілін пасля пачатку "заняткаў" перад сцэнай танцавалі дзясяткі пар, сярод якіх было шмат і моладзі, і людзей сталага пакалення, што з задавальненнем выконвалі ўсе неабходныя танцавальныя "па".

Па словах начальніка аддзела ідэалогіі, культуры і маладзёжнай палітыкі Кобрынскага райвыканкама Надзеі Жук, падобныя выезды за мяжу для калектываў з Беларусі вельмі важныя. "Нашы бабулі прыязджаюць з падобных фестываляў узрушаныя і, як быццам, памаладзелыя, бо яны бачаць, што за мяжой іх цёпла прымаюць, цэняць іхнюю творчасць так сама, як і ў Беларусі. І гэта дае ім новыя сілы для ўдзелу ў новых сустрэчах ды фестывалях", — адзначыла яна.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ
Фота аўтара

“Мінусоўка”! І навошта “варушыцца”?

Творчасць аматараў: феномен Новай Мышы ці кліку мышкай?

З творчасцю Алега ВЕНГЕРА нашы чытачы ўжо знаёмы: у № 31 “К” друкавала яго фартэпіянныя творы для пачаткоўцаў, у тым ліку — для юных джазменаў. Старшыня Савета Асацыяцыі кампазітараў Брэсцкай вобласці, член Саюза кампазітараў Украіны (Крымская вобласць), кіраўнік народнай эстраднай студыі Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, выкладчык Дзіцячай школы мастацтваў № 1 Пінска, член журы многіх конкурсаў, фестываляў і адборачных камісій, Алег Іосіфавіч падзяліўся думкамі пра стан цяперашніх аматарскіх музычных калектываў і пра многае іншае, што “набалела”.

— Узровень музычнага аматарства ў нас расце, прычым можна заўважыць пэўныя тэндэнцыі. У лідары пачынаюць выбівацца маленькія гарады, мястэчкі, нават вёскі — тая ж Новая Мыш Баранавіцкага раёна. Бывае, у якім-небудзь сельскім Доме культуры можна знайсці апантаных кіраўнікоў, што трымаюць свой калектыў у форме, вядуць падрыхтоўку, нягледзячы на не самыя, здараецца, спрыяльныя ўмовы. Можа, спрацоўвае яшчэ і тое, што ў сваім населеным пункце такія калектывы становяцца культурным “цэнтрам прыцягнення” — і адораных людзей, і самой грамадскай увагі? У такіх умовах папросту не пражывеш на адным і тым жа рэпертуары, які штогод паўтараецца, а ўзровень — патроху дэградуе. А вось у буйных гарадах бывае акурат наадварот. Я, вядома, не абагульняю — ні ў якім разе! Але такая тэндэнцыя, на жаль, намецілася: пачынаюць варушыцца толькі тады, калі прыходзіць чарговая папера, што называецца, “зверху”. Вы ж ведаеце, што раз на тры гады аматарскія калектывы, якія носяць званне “народны”, павінны яго пацвердзіць. А для гэтага яны мусяць прадставіць камісіі, што выязджае да іх, новую праграму. Вось тады і пачынаецца праца! А што ж вы рабілі раней? Жылі “напрацаванай славай”?

— Пэўна, аматарскія калектывы маюць патрэбу ў падтрымцы? Творчай, метадычнай, матэрыяльнай...

— Думаеце, яе няма? Так, і тут патрабуецца ўдасканаленне, але шмат залежыць ад кіраўнікоў, ад іхняга жадання ўвесь час ісці далей — ці спачываць на лаўрах. Матэрыяльная база апошнім часам палепшылася. Сёння ўжо ўсе маюць больш-менш прыстойную гукаапаратуру, тэхнічнае абсталяванне. А вось умення карыстацца ім напоўніцу пакуль бракуе. Можна, вядома, радавацца, што тыя ж фанаграмы-“мінусоўкі”, асабліва ў эстрадных песнях, сталі лепшымі па сваіх тэхнічных характарыстыках. Але за кошт чаго? Часцей за ўсё гэта — не новыя аранжыроўкі, зробленыя кіраўніком эстраднай студыі, як было раней, а проста спампаваныя з Інтэрнэту гатовыя. На некаторых адборачных праслухоўваннях можна пачуць адную і тую ж патрыятычную песню ледзь не дваццаць разоў, і ўсё — з адной аранжыроўкай, толькі спевакі змяняюцца. А ў ідэале, кожнаму салісту патрэбен індывідуальны падыход, і раней загатаваная “мінусоўка” — гэта караоке, а не ўзровень таго ж нацыянальнага конкурсу.

— Наколькі я разумею, няма таго ж матэрыяльнага стымулу: ці са старой аранжыроўкай, ці з новай — на прыбытку гэта ніяк не адаб’ецца. Нават наадварот! Асабліва калі хтосьці захоча замовіць такую апрацоўку спецыялістам ці хаця б выкарыстаць які-небудзь “жывы” інструмент, а не адно электроніку.

— Дык вы і самі ўсе прычыны азначылі — так і ёсць! Умення “ладзіць” з тэхнікай, а не проста спажываць гатовыя камп’ютарныя нарыхтоўкі — нуль. Стымулаў — ніякіх. Прычым не толькі матэрыяльных. У тыя ж савецкія часы хаця б граматы выдавалі, неяк ушаноўвалі. Сёння ж выступіў, паўдзельнічаў — і добра. А якасць быццам бы не ў лік. Раней практычна пасля кожнага мерапрыемства быў “разбор палётаў”: хтосьці атрымліваў крытыку — і мусіў выпраўляцца, хтосьці — ухвалу. Сёння ж ацэначны фактар амаль што знік — ну хіба тэлебачанне нейкія праекты ладзіць, тыя ж “Спеўныя гарады”. Але на такіх абмеркаваннях “на ўсю краіну”, калі сказанае трапляе на тэлеэкран, кожны з членаў журы, зразумела, будзе шукаць, за што падтрымаць, адзначыць удзельніка. Шчырая ж размова спецыялістаў з кіраўнікамі здараецца не часта…

Дарэчы, а ці гатовы яны самі бываюць да крытыкі і канкрэтных парад? Сама неаднойчы трапляла ў сітуацыю, калі падыходзіш пасля выступлення, спрабуеш штосьці падказаць — і натыкаешся на элементарнае непаразуменне: маўляў, мы ж такія “крутыя”! Шматлікія інструментальныя калектывы, якія існуюць сёння ў кожнай школе мастацтваў і складаюцца з яе выкладчыкаў, вымушаны рабіць аркестроўкі — з разлікам на свой нетрадыцыйны склад. Самая распаўсюджаная памылка — усе граюць разам і ва ўнісон, з-за чаго большасць інструментаў “губляецца”. Чаму б не пашукаць ансамблевыя спалучэнні, цікавыя сваёй “празрыстасцю”, нешараговасцю, — і на кульмінацыі з’яднаць усіх?

— Зірнём на гэта больш шырока: можа, чагосьці бракуе ў самой сістэме адукацыі?

— З ВНУ прыходзяць ці салісты, ці менеджары. І хаця ў дыпломе некаторых пазначана “Кіраўнік аматарскага калектыву”, сапраўдныя прафесійныя якасці гэтай спецыяльнасці напрацоўваюцца толькі практыкай. Бо патрэбна ўмець — усё. І пачынаць трэба з маленства. У тых жа музычных школах абавязкова трэба вучыць імправізацыі і сачыненню, знаёміць з джазавымі, блюзавымі гармоніямі, выхоўваць уменне граць без нот, па слыху. Іншымі словамі — музіцыраваць, у самым шырокім сэнсе. Вядома, для гэтага неабходна развіццё тэхнікі, тыя ж гамы, сальфеджыа — без класічных асноў ну ніяк не абыдзешся! Але ў нас тэорыя і практыка часта разведзены ў розныя бакі і амаль не сутыкаюцца. На маю думку, дзіця можа не ведаць мудрагелістыя назвы акордаў (даведаецца пазней), але павінна ўмець імі карыстацца. Што ж да музыкантаў старэйшага пакалення, дык першаснай з’яўляецца ўласная ініцыятыва, прага новых ведаў. Я неаднойчы выступаў і з такой прапановай: замацаваць за кожным рэгіёнам таленавітых музыкантаў, якія раз на месяц будуць слухаць тамтэйшыя кадры, сачыць за іх развіццём. Але весці такую працу на грамадскіх пачатках — немагчыма.

— Вы ўзначальваеце Асацыяцыю кампазітараў Брэстчыны. Ці могуць музыканты-аматары разлічваць на яе дапамогу?

— Асацыяцыя ўзнікла два гады таму, у яе ўваходзіць прыблізна дваццаць чалавек. І стваралася яна менавіта з мэтай з’яднаць і накіроўваць у патрэбны бок кіраўнікоў аматарскіх калектываў, папулярызаваць творы мясцовых аўтараў. За гэты час выйшлі два зборнікі — песенны і інструментальны. Асабліва прыемна, што іх выданне было запланавана аблвыканкамам, які і ўзяў на сябе ўсе выдаткі. Так што мы вельмі ўдзячны за падтрымку. Ад нас патрабавалася творчае “начынне”. У першым зборніку — “Чэрвеньская ноч” — былі змешчаны эстрадныя песні, пададзеныя ў выглядзе мелодыі са словамі і пазначанай гарманізацыяй. Другі — "Музычны падарунак"— з’яднаў дванаццаць твораў для розных інструментаў ды ансамбляў, там былі прадстаўлены і такія распаўсюджаныя ў аматарскім выканальніцтве інструменты, як гітара, баян. Усё разлічана на сярэднюю ступень складанасці, каб гэта было, з аднаго боку, пад сілу музыкантам-аматарам, з іншага ж, каб пашырала іх рэпертуар і ставіла перад імі новыя задачы. Мы збіралі не тыя творы, што пісаліся “ў стол”, а тыя, што будуць рэальна выконвацца. Да таго ж, усе прапанаваныя да выдання творы ўжо былі апрабаваны ў практыцы і атрымалі прыхільнасць музыкантаў ды слухачоў. Сябры нашай Асацыяцыі жывуць па ўсёй вобласці, таму сумесныя сустрэчы праводзяцца прыблізна два разы на год. Але кожная такая нарада мае плён, садзейнічае абмену вопытам. На пачатак восені, да прыкладу, мы запланавалі запрасіць спецыяліста па ахове аўтарскіх правоў, каб той аказаў нам юрыдычную кансультацыю. Пытанняў падобнага роду назбіралася шмат…

Гутарыла Надзея БУНЦЭВІЧ

Разбурыць маёнтак...

Каму гэта выгадна?

Культурная інфраструктура і яе адсутнасць

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 10 — 11.)

Інавацыя і галоўнае свята аграгарадка

На парадку дня — **Бялыніцкі раён**. СДК у **вёсцы Галоўчын** мы шукалі доўга.

Справа ў тым, што ў вёсцы — два дамы культуры. Адзін — дзеючы, а іншы — ці то былы, ці то будучы. Мясцовыя жыхары сваімі падказкамі канчаткова заблыталі нас, і мы зноў задумаліся над тым, чаму ў буйных вёсках на галоўных плошчах адсутнічае рэклама, ва ўсіх яе іпастасях, дзейнасці мясцовых культурных устаноў. У выніку знайшлі ўстанову культуры толькі ў 15.05. Пяць хвілін таму СДК зачыніўся на абедзенны перапынак... Бібліятэкары ж папярэдзілі абвесткай, што з’ехалі ў зону абслугоўвання. А шкада, вельмі хацелася б пазнаёміцца і з мясцовай дзіцячай школай мастацтваў ды музеем…

Віцебшчына была першай у стварэнні сеткі раённых дамоў рамёстваў. Магілёўшчына, на мой погляд, першай пачала паглыбляць дадзеную ідэю да масавага практычнага навучання дзяцей тым традыцыйным рамёствам, якімі вольна валодалі іх дзяды і прадзеды. Адна з першых школ рамёстваў узнікла ў Горках... Вось і ў Галоўчыне пачаў дзейнічаць рамесніцкі клас... Кажуць, традыцыя — невынішчальная. Не магу з гэтым пагадзіцца. Бацька распавядаў мне калісьці пра старадаўняе мастацтва рэзкі шкла ў вадзе, пра стральбу праз рэчку (шрот адскоквае ад вады рыкашэтам і трапляе ў нябачную для стралка цэль; згадкі пра гэта ёсць і ў Караткевіча). Але я быў малы і нічога не занатоўваў. Шкада... А вось дзецям у Галоўчыне, відаць, сумаваць па забытай традыцыі не давядзецца.

Агульнае лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

А вось у **Вішове** (15.25, 567 км) нам пашанцавала. Здавалася б, зачынены і клуб, і бібліятэка. Але, як высветлілася, і бібліятэкары, і клубнікі ладзілі ў тую пятніцу ці не самае галоўнае гадавое мерапрыемства — духоўнае свята ў гонар апосталаў Пятра і Паўла, на якое, што вельмі паказальна, падвозілі ветэранаў працы з навакольных вёсак. Абмінуць такую падзею і не ацаніць творчы патэнцыял раёна мы не маглі, балазе калектывы выступалі не толькі вішоўскія, але і з іншых дамоў культуры раёна, а таксама з Мінска. Як расказала рэжысёр Вішоўскага СДК Валянціна Паўловіч, мясцовы амфітэатр, якому ўжо пяць гадоў, актыўна выкарыстоўваецца для канцэртаў, правядзення народных абрадаў: маёвак, Масленкі, дажынак, Купалля. Вялікую дапамогу, у тым ліку з набыццём касцюмаў, апаратуры, аказвае мясцовая гаспадарка.

Валянціна Паўловіч падзялілася клопатам: маладых спецыялістаў не хапае, маюцца вакансіі. Гэта, у сваю чаргу, адмоўна адбіваецца на працы Дома культуры. Сумны прыклад. Колькі гадоў у аграгарадку плённа працаваў фальклорны дзіцячы калектыў. Цяпер яго кіраўнік — у дэкрэтным адпачынку, а ўдзельнікі ансамбля вымушана займаюцца эстраднай музыкай...

Тры дні падарожжа. За гэты час мы зноў праехалі ці не 800 кіламетраў, завіталі ва ўстановы культуры васьмі раёнаў... Пабачылі шмат станоўчага, але хапіла і адмоўнага. Якія толькі брэнды ні трапілі ў нашу журналісцкую калекцыю! Безумоўна, за час кароткачасовых візітаў зразумець усю паўнату сітуацыі ў рэгіянальнай культуры вельмі цяжка. Тым не менш, мы ўбачылі і захаванне фальклорнай аўтэнтыкі, і адносіны да архітэктурнай спадчыны, і рознае стаўленне да сваёй працы. Але ці не самае галоўнае — у чарговы раз пераканаліся: кожны з гэтых васьмі раёнаў мае сваю адметную рэгіянальную культуру. Гэта дарагога каштуе. Але ж нястача прафесійных кадраў даецца ў знакі. І ў што яна з цягам часу выльецца — пакуль не зразумела...

Агульнае лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Яўген РАГІН і Кастусь АНТАНОВІЧ, нашы спецыяльныя карэспандэнты
Мінск — Віцебская вобласць — Магілёўская вобласць — Мінск
Фота аўтараў

У шведскім музеі галоўныя — псіхолаг і рэжысёр

Музей Васа ў Стакгольме прысвечаны гісторыі адзінага ў свеце захаванага да сёння карабля пачатку XVII стагоддзя.

Праца з кожным, а не з плынню

Вікінгі ў экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Швецыі.

У Музеі сучаснага мастацтва Швецыі.

Не так даўно прадстаўнікі айчыннай музейнай супольнасці гасцявалі ў шведскіх калег: гэта быў абмен вопытам і прафесійная вучоба. Быў у складзе дэлегацыі і дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Алег РЫЖКОЎ. Пра свае ўражанні ад вандроўкі ён распавёў карэспандэнту "К".

Канцэпцыя — блізкая

— Жыццё не стаіць на месцы: змяняюцца патрэбы наведвальнікаў, з'яўляюцца новыя музейныя тэхналогіі — адпаведна, мусяць змяняцца падыходы да пабудовы экспазіцыі. Таму трэба ездзіць і глядзець. Запрасіў нас у Швецыю Глабальны фонд культуры.

Што да тамтэйшых музеяў, дык іх практыка канцэптуальна блізкая да нашай. Калегі, як і мы, прытрымліваюцца класічнай пабудовы экспазіцыі, а сучаснымі тэхналогіямі карыстаюцца асцярожна ды тактоўна.

Павучыцца ж у іх варта працы з наведвальнікамі: яны вельмі ўважліва ставяцца да кожнага. У Швецыі існуе градацыя наведвальнікаў музеяў па ўзросце, сацыяльным стане: дзеці, падлеткі, дарослыя, сямейныя людзі, пенсіянеры... Нават аналізуюць успрыманне адной і той жа экспазіцыі мужчынамі ды жанчынамі. Выстаўкі ж будуюцца на рэкамендацыях псіхолагаў. Нам такога не стае. Мы арыентуемся на сярэднюю плынь, не робім акцэнту на катэгорыях…

Педагогіка, рэстаўрацыя, абмен

— У калег цікавая форма музейнай педагогікі. Мы збіраемся ўвесці яе і ў сябе. Магчымасць скарыстання досведу ўжо абмяркоўвалі з Нацыянальным мастацкім музеем.

У нашым разуменні музейная педагогіка — праца са школьнікамі. Прычым школьнікі — нібыта наменклатурная адзінка, якая дазваляе зрабіць план. У Швецыі ж — па-іншаму. Там музейны педагог арыентаваны на розныя катэгорыі людзей. З кожнай катэгорыяй ён працуе парознаму, да кожнай шукае падыход. Можна нават сказаць, што экскурсаводы ў шведскіх музеях працуюць як аніматары. А калі яны бачаць, што іх перастаюць слухаць, што аповед экскурсавода не прыцягвае ўвагі, дык адразу ж імкнуцца пераключыцца на нешта, што будзе наведвальнікам цікава. Такога досведу ў нас вобмаль.

Па-другое, у іх багаты досвед рэстаўрацыі фондавых калекцый. Мяркую, мы дасягнем дамоўленасці ў тым, каб з дапамогай іхніх спецыялістаў ладзіць семінары, майстар-класы для нашых рэстаўратараў. Хацелася б, і каб профі прыязджалі да нас ды працавалі з нашымі экспанатамі.

А трэці момант — абмен выстаўкамі. Пра гэта вядзём перамовы з Нацыянальным гістарычным музеем Швецыі. Калі ў нас гасцілі шведскія калегі, ад іх можна было пачуць: "Мы пра вас нічога не ведаем…" А гэта людзі, якія маюць дачыненне да культуры, да гістарычнай навукі! А мы ж — фактычна суседзі па глабальных мерках: паміж Мінскам і Стакгольмам — гадзіна самалётам.

Думаю, што шведам варта паказаць не нейкія фрагменты культуры або асобныя падзеі нашай гісторыі, але даць агульнае ўяўленне пра Беларусь, пра глыбіню нашых гісторыка-культурных каранёў, распавесці, хто ж такі беларус і адкуль ён. Шведаў, дарэчы, вельмі зацікавіла беларуская археалогія і этнаграфія.

Беларускі музейны праект для Швецыі, на маю думку, мусіць прадстаўляць увесь гістарычны шлях нашага народа — ад старажытнасці да нашых дзён. А кожны з айчынных музеяў, які спрычыніцца да гэтага праекта, будзе працаваць над сваім сегментам. Але найперш музейшчыкам трэба знайсці стрыжань, які потым абрастаў бы канкрэтыкай…

Пра турызм

— Яшчэ хачу дадаць, што шведскі досвед можа быць карысным для Міністэрства спорту і турызму. У Швецыі на кожным кроку — бясплатныя раздачы карт: па музеях, па шопінгу, па відовішчах, па начным жыцці горада — на любы густ і кішэню. Дзякуючы гэтаму ўжо праз дзень лёгка арыентуешся ў горадзе.

Што яшчэ згадаць? У Швецыі — вялікая колькасць мемарыяльных музеяў. Прычым такім чынам ушаноўваюць памяць не нейкіх вялікіх асоб, а рупліўцаў дзеля грамадскай карысці. Вось пайшоў з жыцця чалавек, які нешта вартае зрабіў, — і тут жа ў ягонай кватэры ствараецца мемарыяльны музейчык. Экспазіцыя ў іх сфарміравана так, што няма патрэбы ў тлумачэннях. Камфортна чаргуюцца зоны сузірання, рэлаксацыі, інтэрактыву. Карэктна скарыстоўваюцца лічбавыя тэхналогіі.

Большая частка экспазіцый у шведскіх музеях не агароджана ні шклом, ні бар'ерам: лічыцца, што такім чынам дасягаецца большы эмацыйны кантакт паміж музейным прадметам і гледачом. Стварэнне экспазіцыі пачынаецца з рэжысуры. У нас у структуры музея таксама прапісана такая функцыянальная адзінка, але яе роля — значна меншая. У нас экспазіцыю стварае мастак, а рэжысёр прыходзіць потым. Практыка шведаў падаецца мэтазгоднай…

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Рэйтынг ідэй з інтэрнэт-прасторы

Прыцягвайце ўвагу да праектаў!

Вера САВІНА, кінасцэнарыст, журналіст, актывіст Клуба-музея Чэслава Нэмэна ў вёсцы Старыя Васілішкі Шчучынскага раёна

Яшчэ больш працаваць у Сеціве стала, калі актыўна занялася ініцыятывамі на карысць спачатку стварэння Музея Чэслава Нэмэна ў яго родных Старых Васілішках, што на Шчучыншчыне, а цяпер — далейшага развіцця ўстановы.

1. Нэтворкінг

Узнікла вялікая сетка кантактаў, што прывяло да стварэння супольнасці сяброў Музея Чэслава Нэмэна ў "Фэйсбуку". Цяпер іх — больш за 130 чалавек. Пачаўся абмен думкамі, прапановамі, унікальнымі матэрыяламі як з розных сайтаў, так і з асабістых архіваў. Завязаліся цікавыя знаёмствы з людзьмі, тымі, што любяць гэтага вялікага музыканта, тымі, хто неабыякавы да лёсу яго дома і музея.

2. Сайт музея ў Старых Васілішках

Рэсурс таксама прыцягнуў увагу да ўстановы. Сталі прыходзіць водгукі, прапановы супрацоўніцтва, дапамогі Клубу-музею не толькі з Беларусі, але і з іншых краін. Радуе, што некаторыя з іх выліліся ў цалкам канкрэтныя справы.

3. Насычэнне для канцэпцыі

Калі стварала праект канцэпцыі развіцця Музея Нэмэна, знайшла шмат цікавай інфармацыі ў Інтэрнэце: пра тое, як існуюць, як жывуць ды выжываюць маленькія рэгіянальныя музеі ў нас і за мяжой. Цікавы ды карысны вопыт! Рэкамендую звярнуцца па яго і нашым музейшчыкам.

4. Перапіска

Стала вяду перапіску з рознымі дзяржаўнымі ўстановамі ды інстанцыямі, ад якіх у вялікай ступені залежыць, як будзе развівацца музей і ці ўдасканаляцца формы дзейнасці. Тое, на што раней патрабаваліся б тыдні, цяпер адбываецца за некалькі секунд: і лісты, і выяўленчыя матэрыялы, і макеты прапаноў.

5. Слоўнікі

Безумоўна, часта карыстаюся замежнымі энцыкляпедычнымі інтэрнэт-слоўнікамі, бо яны сапраўды вельмі эканомяць час. Хоць бывае, што інфармацыю трэба неаднаразова перапраўляць ды спраўджваць па іншых крыніцах. На шчасце, усё тое можна зрабіць у Інтэрнэце.

Герб апошняга з Рэйтэнаў

Лёс капліцы на Ляхавіччыне, збудаванай па тэстаменце шляхціча

Першы Рэйтэн з'явіўся на нашых землях у самым пачатку 1600-х гадоў з Прусіі. Пахаваны быў у 1639-м у Сталовічах. Апошні ж — Юзаф — нарадзіўся 7 студзеня 1857 года. 17 жніўня 1910-га пасля працяглай і цяжкай хваробы ён памёр у новым сядзібным будынку ў Грушаўцы, што на Ляхавіччыне. Месца, дзе павінны былі пахаваць ягонае цела, Юзаф абраў загадзя: ім стаў пагорак, што дамінуе па-над наваколлем. Згодна з тэстаментам, на гэтым месцы з адмысловай фундацыі Юзафа пазней мусілі пабудаваць капліцу, дзе знайшлі б спачын апошнія з Рэйтэнаў: бацькі Юзафа, сястра, а таксама дзед, падпалкоўнік напалеонаўскіх войскаў, які змагаўся за Вялікае Княства Літоўскае.



Капліца Рэйтэнаў ля Грушаўкі.

Можна сабе ўявіць, якой была шматлюдная жалобная працэсія, што пасля набажэнства ў Ляхавіцкім касцёле суправаджала труну нябожчыка да месца спачыну… Былі тут і простыя людзі, якім шмат дапамагаў Юзаф, і дзеці-сіроты, каго апекавалі Рэйтэны, і мяшчане з Ляхавіч ды іншых мястэчак, шляхта з ваколіц…

На магіле ж, згодна са старадаўнім звычаем, быў разбіты герб апошняга з рыцарскага роду.

Гады ліхалецця

Неўзабаве Ляхавіччына ператварылася ў сапраўднае пекла. Першая сусветная вайна, якая намалявала крывавую лінію фронту, прайшла крыху на захад ад Грушаўкі. Нават праз дзесяць гадоў пасля таго, як вайна скончылася, па ўспамінах тутэйшых жыхароў, шлях ад Баранавіч да Грушаўкі ішоў праз татальна занядбаныя землі, зрэзаныя акопамі, абмураваныя ДАКамі і бліндажамі. Старажытныя лясы былі высечаны "ў пень", сядзібы і вёскі — спалены. Як ацалела грушаўская сядзіба ў той агнявой віхуры, толькі богу вядома…

Далей былі Кастрычніцкі пераварот 1917-га, заснаванне Беларускай Народнай Рэспублікі… Нарэшце, 1921 год з Рыжскай дамовай, што рассекла наш край…

Будаўніцтва капліцы

Надышоў год 1924-ты. Апошнія дыверсійныя аддзелы і банды ліхіх людзей, што трымалі ў жаху ваколіцы Грушаўкі, зніклі. Але польская ўлада распачала паланізацыю беларускіх земляў. Ды мясцовая шляхта называла сябе па старадаўнім звычаі ліцвінамі. Граф Генрык Грабоўскі, пляменнік апошняга з Рэйтэнаў, аднойчы ў Мінску нават прымусіў Юзафа Пілсудскага піць за Вялікае Княства з кубка, які падарылі Тадэвушу Рэйтэну сябры па сойме. Кубак гэты са срэбра, з выгравіраваным надпісам, захоўваўся ў Грушаўцы, пакуль Грабоўскі не падарыў яго Музею Чартарыйскіх у польскім Кракаве. На запыты пра далейшы лёс прадмета адказ быў просты: "Лёс невядомы".

Але вернемся да капліцы. Архітэктар, які стварыў дзіўнай прыгажосці праект, нам невядомы. Праўда, падказкай можа паслужыць дакументацыя іншай капліцы, падобнай да грушаўскай. У родавай сядзібе Талочкаў у Вярдомічах, што не так далёка ад Наваградчыны, у 1915 годзе была скончана будоўля. Аўтарам праекта тамтэйшай капліцы, які зацвердзілі ў 1906-м, з'яўляўся вядомы віленскі архітэктар М.Прозараў. Вельмі верагодна, хоць і не бясспрэчна, што Юзаф Рэйтэн перад сваім сконам мог замовіць праект Прозараву. Генрык Грабоўскі, якому па тэстамэнце адышла Грушаўка ды іншыя землі Рэйтэнаў, мог адшукаць гэты праект і, выкарыстоўваючы фонд, што Юзаф прымеркаваў на будоўлю капліцы, заняцца ўзвядзеннем апошняй. Але, паўтаруся, усё магло быць і інакш.

Такімі выбоінамі, на жаль, зеўрае дах пабудовы.

Верагодна, падрыхтоўчыя работы распачаліся ў 1924-м — 1925-м гг. Трэба было замовіць, стварыць, зацвердзіць праект, атрымаць дазвол на будоўлю. Таму сама яна пачалася, хутчэй за ўсё, не раней за 1926 год. Вядома, што з вялікай цяжкасцю Генрык Грабоўскі змог знайсці пляскатую дахоўку, а таксама прывезці з польскіх Кельцаў мармур для памятных дошак, якія меліся ўстанавіць у капліцы. У ёй, як мы памятаем, збіраліся перапахаваць рэшткі Рэйтэнаў, што ў XIX стагоддзі знайшлі былі спачын на парафіяльных могілках у Ляхавічах. Таму Грабоўскаму патрабавалася атрымаць дазвол на эксгумацыю, а потым яшчэ і на перавоз трун.

Адкрыццё капліцы, а дакладней, урачыстасці, звязаныя з асвячэннем памятнай дошкі з выявай Тадэвуша Рэйтэна і ягонай кароткай біяграфіяй, прымеркавалі да мая 1928-га — сёмай гадавіны ратыфікацыі Рыжскай дамовы…

(Працяг будзе.)

Зміцер ЮРКЕВІЧ, арт-куратар

З працягам

(Працяг. Пачатак у №№ 26, 28 — 32.)

Забойства Пэна: яшчэ адна версія злачынства

Пра лёс галоўных дзеючых асоб

І ў заключэнне — пра лёс галоўных дзеючых асоб "справы аб забойстве Ю.Пэна".

Пасля вынясення прысуду ўсе асуджаныя падалі касацыйныя скаргі, але вынікам гэтага стала перакваліфікацыя прысуду, а тэрміны пазбаўлення волі былі пакінуты тыя ж. Пазней, 25 лістапада 1939-га, Н.Файнштэйн падала яшчэ адну скаргу на рашэнне суда. Аднак калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда БССР рашэннем ад 1 чэрвеня 1940 г. у просьбе асуджанай адмовіла "з-за адсутнасці падстаў да вынясення пратэсту па справе". Неха Файнштэйн і ейная маці адбывалі пакаранне ва Ухто-Іжэнскім лагеры (Комі АССР). Там жа са снежня 1938 г. знаходзіліся Рувім і Залман Файнштэйны. У 1943-м Лея Файнштэйн была датэрмінова вызвалена. Што паслужыла прычынай — невядома. Па словах родных асуджаных, яна спачатку засталася жыць непадалёк ад мясцін, дзе была ў зняволенні, у горадзе Імжэ. А калі выйшла на волю Неха, дык разам з ёй яна пасялілася ў Кішынёве, дзе памерла ў 1961-м. За год да ейнай смерці адзін з сыноў ды ўнукі пабывалі ў маці і бабулі. Іх уразіла галеча, у якой жылі дзве гэтыя жанчыны: у іх маленькай старой хатцы нават падлога была земляная…

Залман Файнштэйн адбыў свой тэрмін цалкам і выйшаў на волю ў 1940 годзе. Потым ён быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Памёр у 1973-м у Ленінградзе. Абрам Файнштэйн пасля вызвалення вярнуўся ў Віцебск. Ён працаваў шаўцом у майстэрні на вуліцы Краснабрыгаднай (непадалёк ад Смаленскага рынку), а два апошнія гады — апальшчыкам у кацельні на вуліцы Жасткова. Памёр, як я ўжо пісаў, у 1968-м. Сямён пакаранне адбываў на Далёкім Усходзе, у лагеры непадалёк ад Хабараўска. Пасля вызвалення ў 1939 г. вярнуўся ў Віцебск. "…Яго сустрэла "сцяна маўчання". Многія знаёмыя, нават сваякі, баяліся з ім мець зносіны <...>, — згадвалі яго дзеці. — Атмасфера страху панавала ў гады сталінізму над усімі, усе баяліся рэпрэсій…" 23 чэрвеня 1941 г. С.Файнштэйн быў прызваны ў армію, баявое хрышчэнне прыняў пад Смаленскам у складзе 653-га стралковага палка. Быў двойчы паранены, вайну скончыў ва Усходняй Прусіі, узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны 1-й ступені і медалём "За баявыя заслугі", а таксама юбілейнымі медалямі. Пасля вайны працаваў спачатку краўцом, але потым перакваліфікаваўся ў майстра па рамонце швейных машын. У 1997-м разам з дзецьмі з'ехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Германію, дзе памёр праз два гады. Пахаваны на яўрэйскіх могілках Дортмунда…

Ю.Пэн. "Вуліца ў Віцебску".

Адзіным, хто не выжыў у цяжкім зняволенні, быў муж Леі — Рувім Файнштэйн. Пра ягоны лёс і да сёння нічога не вядома. Калі ў год магчымага вызвалення (1940 г.) ён не выйшаў на волю, значыць, яшчэ раней памёр у зняволенні. Усе астатнія члены сям'і, нягледзячы на страшныя ўмовы савецкіх лагераў, выжылі. Прычым не магу не адзначыць і такую дэталь: гуманнасць суда адыграла, як гэта ні парадаксальна, фатальную ролю ў лёсе яшчэ адной з асуджаных. Рыва Саламонік-Файнштэйн атрымала ўмоўны тэрмін, у турме (лагеры) яна не сядзела. Але гэта не выратавала яе праз чатыры гады, восенню 1941-га: жанчына разам са сваёй маленькай дачкой загінула ў віцебскім гета…

(Заканчэнне будзе.)

Аркадзь ПАДЛІПСКІ
Віцебск

Ю.Фалат. "Лось". 1888 г.

Юліян Фалат і яго Беларусь

"Бог цябе сюды паслаў — любі Нясвіж, як Нясвіж цябе палюбіў..."

(Працяг. Пачатак у №№ 31 — 32.)

...Канешне ж, сюжэты большасці твораў Фалата, на першы погляд, — непераборлівыя, сціплыя. Але гэта жывыя кавалачкі "дакументальнай" рэальнасці, па якіх сёння можна разважаць і пра побыт беларускага сялянства, і пра норавы беларускай шляхты канца XIX стагоддзя. Дарэчы, у 2010-м на мінскай выстаўцы "Польскае выяўленчае мастацтва 2-й паловы XVIII — 1-й паловы XX стст." (з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі) былі прадстаўлены алоўкавы партрэт егера і акварэльны партрэт Станкевіча.

У час фашысцкай акупацыі Польшчы, у жніўні 1944 года, дзве карціны Фалата — "Паляванне" і "На паляванне" — былі вывезены нацыстамі з Нацыянальнага музея Варшавы ў Германію, а потым нейкім чынам апынуліся ў ЗША. Прадстаўнікі польскага пасольства ў Штатах выпадкова знайшлі іх у 2006-м у нью-ёркскіх аўкцыённых дамах "Christie's" і "Doyle". Адразу ж звярнуліся да амерыканскага ўрада з просьбай ініцыяваць адпаведнае расследаванне. Яно доўжылася амаль чатыры гады. І толькі ў снежні 2010-га Манхэтанскі суд пастанавіў, што карціны павінны быць вернуты Польшчы, бо ўяўляюць з сябе незаконна вывезеную ў час Другой сусветнай вайны маёмасць. Такім чынам, творы Фалата былі перададзены толькі што абранаму новаму Прэзідэнту Польшчы Браніславу Камароўскаму, які знаходзіўся якраз у гэты час у Нью-Ёрку на сесіі Генеральнай асамблеі ААН…

Нейкі час гэтыя творы Фалата ўпрыгожвалі варшаўскі Палац Прэзідэнта (на вуліцы Кракаўскае прадмесце, 46/48), там, дзе знаходзіцца і карціна нашага земляка Януарыя Сухадольскага "Смерць Цыпрыяна Гадэбскага пад Рашынам". Потым палотны былі перададзены ў Нацыянальны музей.

…Акрамя Нясвіжа Фалат часта выязджаў у іншыя рэгіёны Беларусі. На Гродзеншчыне, напрыклад, ён пісаў ды рысаваў лясных гаспадароў — ласёў, шмат пейзажаў, асабліва зімовых. З гэтага цыкла ў Львоўскай карціннай галерэі і сёння экспануюцца творы "Снег" і "Ручай у снезе".

Цікавыя малюнкі, у якіх адлюстраваны беларускія сяляне, занятыя сваёй штодзённай працай. Вось, напрыклад, стары селянін у доўгай белай кашулі і ў беларускіх лапцях з лыку. Ён рамантуе граблі, а яго старэйшы сын вострыць касу. Тут жа іншыя прылады працы — саха ды барана. І такіх творчых прыкладаў, дзе яўна адчуваецца сімпатыя мастака да простых беларусаў, — шмат.

Ю. Фалат. Аўтапартрэт. 1910 г.

Фалат, сам па натуры нястомны падарожнік, бываў і на возеры Свіцязь, і ў Міры, Навагрудку, Барысаве, абыходзіў берагі Бярэзіны ды Студзёнкі, дзе рабіў накіды ды пісаў эцюды. Гэтыя эцюды праз некалькі гадоў паслужылі зыходным матэрыялам для стварэння (разам з Войцэхам Косакам) вялікай гістарычнай панарамы, прысвечанай напалеонаўскай эпапеі 1812-га — драматычнай пераправе французскай арміі праз Бярэзіну. У 1896 годзе яна была ўстаноўлена ў Берліне, у спецыяльным будынку на Герварштрасэ. Вышыня гэтага ўнікальнага твора была 16 метраў і 120 (!) метраў у акружнасці. Усе зімовыя пейзажныя матывы па-майстэрску выканаў Юліян Фалат, фігуратыўную частку — Войцэх Косак.

Колькі слоў пра гэтага выдатнага жывапісца, аўтара многіх гістарычных і батальных палотнаў, прысвечаных эпосе Напалеона і Тадэвуша Касцюшкі, польска-беларуска-літоўскаму паўстанню 1830 года супраць Расійскай імперыі. Ён напісаў шмат ваенных сюжэтаў часу Першай сусветнай вайны, у якой сам удзельнічаў. Вучыўся ў Кракаве, Мюнхене і Парыжы. З 1916-га настаўнічаў у Варшаўскай школе прыгожых мастацтваў. Памёр у акупаваным немцамі Кракаве 29 ліпеня 1942 года. Лічыцца аднім з лепшых мастакоў-баталістаў Еўропы, аўтар трох буйных панарам — "Бярэзіна" (сумесна з Юліянам Фалатам), "Рацлавіцы" (пра перамогу касіянераў Тадэвуша Касцюшкі над рускай арміяй генерала Аляксандра Тармасава 4 красавіка 1794 г.), "Егіпецкі паход Напалеона", — а таксама карцін "Крывавая нядзеля. 9 студзеня 1905 года. Пецярбург", "Напалеон на беразе Нёмана", "Князь Юзаф Панятоўскі ў 1812 годзе", "Гусар на снезе", "Касцюшка на кані", "Прысяга Касцюшкі на Кракаўскім рынку 24 сакавіка 1794 года", "Касцюшка вядзе ў атаку", "Грунвальд" і шматлікіх іншых палотнаў.

Што ж да панарамы "Бярэзіна", то яе лёс вельмі драматычны. Спачатку ўсё ішло добра: грандыёзны твор на пачатку 1900-х паказалі ў Варшаве, Кіеве, Маскве. Яго ўсе хвалілі як "лепшую панараму ў свеце". Але ў 1907 годзе панарама аказалася разрэзанай на фрагменты і… распрададзена. Прычынай таму, па некаторых сведчаннях, была сварка яе стваральнікаў — Войцэха Косака і Юліяна Фалата. Мабыць, канфлікт гэты разгарэўся з-за ступені ўдзелу аўтараў у стварэнні панарамы? Дакладна не ведаю. Словам, дайшло да дуэлі. Косак выстраліў першым, але прамахнуўся. Фалат жа ў апошні момант страляць не захацеў. Былыя сябры і аднадумцы моўчкі разышліся ў розныя бакі. Але справа скончылася тым, што ў 1907 годзе Войцэх Косак уласнаручна разрэзаў панараму на часткі, кожную, якую лічыў "сваёй", падпісаў "Wojciech Kossak", а пазней пусціў на продаж…

Пошук гэтых фрагментаў у далейшыя гады — гэта асобная старонка амаль дэтэктыўнай гісторыі XX стагоддзя. Адзін з фрагментаў трапіў у Люблянскі музей напрыканцы 60-х гадоў пасля таго, як яго прадаў за вялікія грошы прыватны калекцыянер. Твор з выявай стомленых асуджаных салдат былой "Вялікай арміі" быў у жудасным стане, але ўмелыя рукі польскіх спецыялістаў змаглі яго адрэстаўраваць.

Наступны, мабыць, самы вялікі, фрагмент "Спальванне сцягоў" (цэнтральная частка панарамы) знаходзіцца ў Нацыянальным музеі Кракава. Пасля шматдзённых кровапралітных бітваў, голаду і нягод, армія Напалеона 23 лістапада 1812 г. прыбыла ў беларускае мястэчка Бобр. Тут імператар атрымаў паведамленне пра заняцце войскамі Чычагава горада Барысава. Такім чынам французы апынуліся як бы ў акружэнні. І тады Напалеон загадаў сабраць штабныя паперы, частку абозу і сцягі ("арлы") усіх карпусоў трох гвардзейскіх дывізій ды кавалерыі і спаліць, каб яны не дасталіся праціўніку. А праз тры дні пачаў пераправу праз Бярэзіну пры вёсцы Студзёнка — за шэсць вёрст вышэй Барысава. Эпізод "Спальванне сцягоў" аўтары панарамы перанеслі бліжэй да Бярэзіны, тым самым трошкі парушыўшы гістарычную праўду. Але ў дадзеным выпадку вялікай ролі ў мастацкім творы гэта не іграе.

І вось той фрагмент: перад вогнішчам на барабане сядзіць імператар у гвардзейскім мундзіры і футры (яго пасля падпісання летам 1807 г. нявыгаднага для Расіі Тыльзіцкага міру падарыў Напалеону яго "сябра", рускі цар Аляксандр I). Побач — панурыя маршалы, салдаты-гвардзейцы, кавалерысты. Сцэна, канешне ж, вельмі паказальная: тут, у Беларусі, на гэтым месцы, па сутнасці, скончылася бліскучая ваенная эпапея вялікага палкаводца ўсіх часоў і народаў. А слова "Бярэзіна" для кожнага француза стала гаваркой назвай. Мабыць, невыпадкова Косак напісаў пад карцінай знакамітае выслоўе: "Так мінае людская слава…".

Гэты фрагмент з'явіўся ў Варшаўскім музеі яшчэ да Другой сусветнай вайны. Сын вядомага палітыка пачатку XX стагоддзя, маршала Сейма Галіччыны Станіслава Бадэні — Стэфан Бадэні і ягоная жонка Марыя Яблаоўская купілі яго (яшчэ да ад'езду з акупаванай Польшчы ў Будапешт) на аўкцыёне ды падарылі музею. Потым Стэфан апынуўся ў канцлагеры Маўтхаўзен, але цудам выжыў. Памёр у Дубліне ў 1961-м, а ягоная жонка пайшла з жыцця яшчэ 20 гадоў да таго. На пачатку 2000-х карціна таксама ўпрыгожвала Прэзідэнцкі палац, а потым яе вярнулі на законнае месца...

(Працяг будзе.)

Барыс КРЭПАК

а•ф•і•ш•а «К»

З 17 ЖНІЎНЯ — ДА 24 ЖНІЎНЯ

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- **"Партрэты ўладароў і магнатаў Вялікага Княства Літоўскага"** (з музеяў Львова і Луцка) — да 26 жніўня.
- **"Тры іконы са збораў найбуйнейшых музеяў Беларусі"** — да 26 жніўня.
- **"Слуцкія паясы"** (са збору Львоўскага гістарычнага музея) — да 18 красавіка 2014 г.
- **"З мінулага ў будучыню"** — да 26 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь"**.
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
- **"Водбліскі ваеннай славы"**.
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст."**.

Выстаўкі:
- **"У промнях веры хрысціянскай"**.
- **"Выратаваныя каштоўнасці"** (сумесна з філіялам Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея — музеем "Выратаваныя мастацкія каштоўнасці"). — да 15 верасня.

Інфармацыйна-касавы цэнтр:
- Фотавыстаўка Дзяніса Раманюка **"Беларусь Сінявокая"** — да 31 жніўня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- Фотавыстаўка **"Мір стары — Мір новы"** .
- Выстаўка **"Наваградскі край вачыма Канута Русецкага. З альбома 1844 — 1846 гг."** — да 30 верасня.
- Выстаўка аўтарскіх лялек **"Малая гасцёўня"** — да 31 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА



г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
- Выстаўка **"Якуб Колас у эміграцыйным друку"**, прысвечаная VI З'езду беларусаў свету, — да 29 жніўня.
- Выстаўка **"Сягодня журацца бары на Беларусі"**, прысвечаная 57-й гадавіне смерці Якуба Коласа — да 29 жніўня.
- Музейна-педагагічны праект для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту **"Крочым у школу разам з Коласам"** (заяўкі прымаюцца па тэлефоне: +375 17 284 17 02).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ



г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
- Інтэрактыўная гульня **"У пошуках папараць-кветкі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
- Выстаўка **"Былое ў думках ускрашаць..."**, прымеркаваная да 100-годдзя напісання Янкам Купалам рамантычных паэм.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Выстаўкі:
- **"Партызанскі лагер"**.
- Выстаўка дзіцячага малюнка **"Я памятаю! Я ганаруся!"**.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11. Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- Творы **Нікаса Сафронава** — да 8 верасня.
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
- **"Радкі, імёны, лёсы"** (выстаўка літаратуры к. XIX — пач. XX стст. са збору князёў Паскевічаў).
- **"Класікі беларускага мастацтва"** (выставачна-адукацыйны праект).

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32. Тэл.: (8-0232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
- Інтэр'еры гарадскога (храмы Беларусі на старых паштоўках).
- **"Дрэва добрае"** (да 1025-годдзя Хрышчэння Русі).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Скрозь агонь баёў"**.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.
- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60"**.
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.
- Выстаўка мёду.

ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.
- Выстаўка дыпломных работ выпускнікоў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКіМ — да 2 верасня.
- Выстаўка вырабаў беларускіх народных промыслаў і рамёстваў "Белхудожпромыслы" **"Жнівенскія перапевы"** — да 2 верасня.

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Выстаўка пад такой назвай працуе ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі.

"ВЫРАТАВАНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ"

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
- Пастаянныя экспазіцыі: **"Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
- Выстаўка адной карціны Адама Шэмеша **"Партрэт Людвіка Кандратовіча (Уладзіслава Сыракомлі). 1854"** (са збору Літоўскага мастацкага музея).
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка В.Паўленка
  - **"Скарбы Беларусі"**.
  - **"Камунальная кватэра"**.
  - **"Пад знакам Меноры. З гісторыі яўрэйства на Беларусі"** (до 90-годдзя дзеючага Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Шымона Перэса і 100-годдзя з дня нараджэння былога Прэм'ер-міністра Ізраіля Менахема Бегіна) — да 1 верасня.
- Арт-праект **"Вечар у рытмах Грузіі"** — 18 жніўня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- Выстаўка **"Усходні вектар. В'етнам"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02
- Работы Марыі Быкавай **"Цені палацавай эпохі"**— да 15 верасня.
- Старажытнарускае шыццё XV — XVIII стст. са збораў Разанскага гісторыка-архітэктурнага музея-запаведніка **"Жывапіс іголкай"** — да 6 кастрычніка.
- Мастацкія творы Анжалікі Шабалтас **"Востраў белых птушак"** — да 22 верасня.
- Жывапіс У.Кожуха і скульптура С.Бандарэнкі **"Чыстае, светлае, роднае"** — да 8 верасня.
- Старажытнаруская дружынная культура ў археалагічных артэфактах **"З кап'я ўскормленыя"** — да 31 жніўня.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня"**.
- "Зала ўрачыстых прыёмаў".
- асабняка к. XIX — пач. XX стст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак, перададзеных у дар Музею гісторыі г. Гомеля Леанідам Пінскім).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ



г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
- **"Святыні Бацькаўшчыны"**

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Дзмітрый ФІЛІПОВІЧ (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.

Спецкарэспандэнт:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый —
Юрый ІВАНОЎ

Мастацкі рэдактар —
Наталля ОВАД

Карэктар —
Інга ЗЕЛЬГІС

Адрас рэдакцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны:
(017) 290 22 50,
(017) 286 07 97,
(017) 334 57 23
Тэлефон-факс:
(017) 334 57 41
Рэкламны аддзел:
тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by

E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 6 797

Падпісана ў друк
16.08.2013 у 15.00
Замова 3590
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць
ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код: